Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

РОД ШЫМКОВІЧАЎ ☞ 8

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 21 (2506) Год XLIX | Беласток, 23 мая 2004 г. | Цана 2,00 зл.

Закончыў мерапрыемства лаўрэат Гран-пры сёлетняга фестывалю — Дзяржаўны хор Рэспублікі Беларусь імя Рыгора Шырмы...

Спевам да Бога

Міжнародны фестываль „Гайнаўскія дні царкоўнай музыкі", які праходзіў з 9 па 16 мая ў Свята-Троіцкім саборы, распачаўся і закончыўся выступленнямі беларускіх хораў. У час інаўгурацыйнага канцэрта спяваў пераможца мінулагодняга фестывалю Дзяржаўны хор Рэспублікі Беларусь імя Генадзя Цітовіча. Закончыў мерапрыемства лаўрэат Гран-пры сёлетняга фестывалю — Дзяржаўны хор Рэспублікі Беларусь імя Рыгора Шырмы. Поспехаў у фестывалі дабіліся тры іншыя хоры з Беларусі. Прыхадскі хор Уваскрасенскага сабора з Брэста заняў першае месца разам з хорам Успенскага прыхода з Бельска ў катэгорыі парафіяльных гарадскіх хораў. Хор духавенства Гродзенскай епархіі і жаночы хор Манастыра св. Елізаветы з Мінска атрымалі вылучэнне ў катэгорыі іншых хораў. На фестывалі выступіла звыш трыццаці хораў з шасці краін.

— Распачынаючы агляд царкоўных хораў, распачынаеце тыдзень малітваў за поспех і шчасце нашых дамоў, за мір, супрацоўніцтва і адзінства ўсяго свету. Усіх гэтых галін кранаецца царкоўны спеў, — напісаў мітрапаліт Варшаўскі і ўсяе Польшчы Сава ў лісце, зачытаным епіскапам Гайнаўскім Міранам у час адкрыцця фестывалю. Хаця сярод гасцей быў міністр замежных спраў Польшчы Владзімеж Цімашэвіч, а ліст даслаў прэзідэнт РП Аляксандр Кваснеўскі, які трымае патранат над гайнаўскім мерапрыемствам, то арганізатары фестывалю так і не дачакаліся фінансавай падтрымкі з боку польскага ўрада (Міністэрства культуры сфінансавала толькі ўзнагароду для хору). Мерапрыемства адбылося дзякуючы фінансаванню з ваяводскага і павятовага бюджэтаў, гмінных самаўрадаў ды падтрымцы прадпрыемстваў.

Не даехаў Візантыйскі хор „Stavropoleos" з Бухарэста і таму да змаганняў у катэгорыі прафесійных хораў прыступілі толькі два выканаўцы — хор „Масква" Маскоўскага тэатра аперэты і Дзяржаўны хор Рэспублікі Беларусь імя Рыгора Шырмы. Намнога лепшае ўражанне ў публікі выклікаў велізарны беларускі хор, які прадставіў царкоўны спеў на вельмі высокім узроўні. Карані хора сягаюць Беластока, дзе заснаваў яго ў 1939 годзе вясковы настаўнік Рыгор Шырма.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Дзяржаўны хор Рэспублікі Беларусь імя Рыгора Шырмы

— Царкоўны спеў — гэта незвычайная экспрэсія пачуццяў і для ўспрымання яго патрэбнае толькі сэрца, — заявіў дырэктар фестывалю, мітрафорны протаіерэй Міхаіл Негярэвіч, які трэці год узначальвае арганізацыю гайнаўскага мерапрыемства. Гайнаўскую публіку найбольш цікавяць прыхадскія хоры. Хаця ў час конкурсных аглядаў было холадна і мала людзей можна было спаткаць звонку царквы, то ў Свята-Троіцкім саборы было многа публікі. Каб знайсці месцы сядзець, жанчыны прыходзілі намнога раней, чым распачыналіся канцэрты.

У катэгорыі вясковых хораў выступілі толькі два выканаўцы — з Дубіч-Царкоўных і Орлі.

— Выступленне на гайнаўскім фестывалі гэта новае дасведчанне для нашага хору. Можа некаторыя харысты лепш зразумеюць, чаму трэба часта сустракацца на рэпетыцыях. Важна, што моладзь пачала ахвотна спяваць у хоры і я маю надзею, што яна будзе дабівацца поспехаў, — сказала дырыжор з Дубіч Анна Антанюк. — Для мяне важным будзе падглянуць, як іншыя дырыжоры вядуць сябе перад харыстамі.

Дзеткі з прыходаў св. Іаана Багаслова ў Орлі, св. Іаана Хрысціцеля ў Гайнаўцы і св. Мікалая ў Беластоку адважна і прыгожа заспявалі царкоўныя песні. Разнародны рэпертуар паказаў гаспадар фестывалю, хор Свята-Троіцкага прыхода, дзе побач дарослых асоб спявалі вучні з маладзёжнага хору. Публіка мела нагоду параўнаць выступленні прыхадскіх харыстаў з Бельска, Беластока, Сямятыч, Кракава, Крыніцы, Беларусі, Расіі і Фінляндыі. Спеў на вельмі добрым мастацкім узроўні паказаў хор Успенскага прыхода з Бельска. Выдатную большасць хору састаўляюць вучаніцы бельскага белліцэя, белгімназіі або выпускнікі гэтых школ. Побач візантыйскіх мелодый выкарысталі яны старабалгарскія і знаменныя распевы.

— Мы любім спяваць. Калі спяваем, то прыбліжаемся да Бога. Выступаючы ў хоры ёсць нагода падзякаваць за талент, які даў нам Гасподзь, — сказалі выпускнікі белліцэя Іаанна Голец і Агнешка Кучко.

У катэгорыі іншых хораў першае месца атрымаў хор духавенства Беластоцка-Гданьскай епархіі, які цікава прадставіў разнародныя кампазіцыі. Вельмі прыхільна гайнавяне выказваліся наконт выступлення хору Мужчынскага манастыра ў Супраслі, які выконваў напевы супрасльскага ірмалагіёна і спяваў знаменным распевам. Людзі падыходзілі да харыстаў з Супрасля, каб падзякаваць за прыгожы спеў. У гэтай катэгорыі інакш, чым іншыя, прэзентаваліся хор знаменнага спявання для хлопцаў з Масквы і хор „Некрасаўскія казачаты" з невялікай мясцовасці Навакумскій у Расіі. Атрымалі яны спецыяльныя ўзнагароды за цікавую прэзентацыю царкоўнай музыкі ў аднагалосым знаменным спеве. У катэгорыі акадэмічных хораў першыя раўнапраўныя месцы занялі хоры Люблінскага каталіцкага універсітэта і Універсітэта імя Шаўчэнкі з Кіева „Дняпро", якія паказалі спеў на высокім мастацкім узроўні.

Аляксей Мароз

Без перспектывы ☞ 2

Аляксандр Вярбіцкі

Уся стагоддзямі выпрацаваная нашым народам традыцыя развальваецца на нашых вачах, хаця гаварылася, што спадчына будзе ахоплена асаблівa дбайнай апекай... Але ж гэта не канец гэтых нашых, ці не страшнейшых ад дзевяці егіпецкіх, няшчасцяў...

Просьба консулу РБ ☞ 4

Вінцук Вячорка

Кнігі, па якіх дзеці вучыліся, засталіся ў будынку ліцэю. Ён пустуе, але ані вучыцца там, ані кнігі забраць адтуль нельга: будынак ад нас ахоўваюць. Таму прашу Вас, добры чалавеча: дапамажыце і нашым дзецям хаця б беларускімі падручнікамі...

Беларусы Еўропы ☞ 9

Сакрат Яновіч

Польскі лёс беластоцкага энклава беларусаў робіць іх іншымі ад савецкіх (постсавецкіх) беларусаў. Беластачане накіраваны ў бок сусветнай дынамікі; Рэспубліка Беларусь туляецца ў цяні Расіі, удзельная вага якой у глабальнай эканоміцы не перавышае ўсяго двух працэнтаў. Яна, фактычна, паўкалонія Еўропы, яе сыравінны дадатак...

Беларускія спартсмены ☞ 10

Уладзімір Хільмановіч

Польшча як дзяржава дэбютавала на алімпійскіх гульнях у Парыжы ў 1924 годзе. І першы медаль для Рэчы Паспалітай здабыў коннік з Гродна Адам Крулікевіч. У сталіцы Францыі ён стаў трэцім у турніры па пераадоленню перашкод на кані...

XXIII Міжнародны фестываль царкоўнай музыкі Гайнаўка 2004

Беластоцкая філармонія, 25-30 мая 2004 г. — дэталёвая праграма Фестывалю на 11 старонцы.

Ганаровым госцем Фестывалю будзе англійскі кампазітар Джон Тэвенер (на здымку), які выступіць з аўтарскім канцэртам.

Сярод медыяльных патронаў мерапрыемства — наша газета.

Беспрытульная перспектыва

Іслам наступае на Еўропу. Лік мусульман у Германіі, Францыі, Вялікабрытаніі ці Бенілюксе вырас настолькі, што тамашнія ўлады ўсур'ёз успрымаюць ісламскі фактар. Польшча, якая неўзабаве апынецца поруч іх, таксама не абыдзе бокам гэтай праблемы. І справа тут не ў тым, пра што сёння хвалююцца пасажыры цягнікоў ці самалётаў.

Не так даўно праз нашу Еўропу пракацілася хваля хваробы шалёных кароў і ў выніку шмат хто адмовіўся ад ялавічыны. Яшчэ, здаецца, не прыціхла эпідэмія курынага грыпу ў Азіі, а ўжо шмат хто выкінуў кураціну са свайго меню. Астаецца яшчэ свінінка, і нават калі яе не ачэпяць нейкія вірусы, яе будучая прысутнасць на нашых сталах сумнявая. Свініна лічыцца нячыстым мясам не толькі ў наступаючых мусульман, але і ў яўрэяў, пра якіх многія з нас думаюць, што яны круцяць сусветным стырном, і толькі пытаннем часу трэба лічыць, што Брусель пад ціскам так адных, як і другіх, увядзе забарону на спажыванне ў нас саланінкі, кумпячка ці каўбаскі. І, мяркую, нічога не памогуць тут намаганні прэзідэнта Кваснеўскага ўвесці ў еўрапейскую канстытуцыю хрысціянскія вартасці, якія б абаранілі нашы любімыя закусі. Бо калі ў гэтай справе Францыя і Германія, пры падтрымцы Вялікабрытаніі, наваляцца на нас, так як калісь „w oparciu o biedaka ze średniakiem na kułaka" навалілася калектывізацыя, прыйдзецца нам тут праглынуць слінку.

І што ж мы тады будзем есці? Французы, як вядома, з'ядаюць жаб і слімакоў. У французскім калісь Індакітаі, дзе акурат успыхнула згаданая эпідэмія курынага грыпу, на мясных прылаўках заміж кураціны паявіліся смакоцці з пацукоў. Можна на гэта глядзець з агідай, але голад не цётка і трэба будзе праявіць за сталом нейкую адвагу...

З незапамятнага часу вядома ў нас, што найлепшым стымулятарам адвагі з'яўляецца гарэліца, найлепш „родненькая". Толькі вось з полак нашых крамаў быў часова прапаў цукар, які запар з далучэннем да Еўрасаюза мае, паводле першых чутак, падаражэць удвая, але могуць жа з'явіцца і наступныя чуткі. Праўда, прарочаць нам, што патаннее шатландская віскі, бургундскае віно і баварскае піва. Але ж гэта і разваліць „вдребезги" ўсё тое рукадзелле, якім славілася наша ўсходняя сцяна — такую вось наш Цімашэвіч даў выручку свайму электарату за верную выбарчую падтрымку. Ну і як цяпер будзе есці тых, напрыклад, слімакоў: ці пад баварскае піва, ці закусваць імі шатландскую віскі? Уся стагоддзямі выпрацаваная нашым народам традыцыя развальваецца на нашых вачах, хаця гаварылася, што спадчына будзе ахоплена асабліва дбайнай апекай... Але ж гэта не канец гэтых нашых, ці не страшнейшых ад дзевяці егіпецкіх, няшчасцяў. У мусульман жа зусім забараняецца спажыванне ўсяго вясёленькага і ад гэтай бяды дык хіба і сам Лепэр не абароніць нас.

Праўда, Цімашэвіч не так зноў забыў пра свой электарат, бо ж змагаецца ён за добрасуседства з Беларуссю. І калі ўжо нават і што, дык можна будзе за нейкае марнае пяць еўра з'ездзіць у Ваўкавыск ці Пружаны, кульнуць там чарачку і закусіць саланінкай з агурочкам. Але, на жаль, трэба будзе ўжо думаць пра адвыканне ад гэтых ласункаў і ў Беларусі...

Віцэ-прэзідэнт расійскай Акадэміі геапалітычных праблем генерал-палкоўнік Леанід Івашоў піша на старонках „Независимого военного обозрения": „С запада и востока дожимают Лукашенко, и не исключено скорое втягивание Белоруссии в орбиту Североатлантического блока"; гэта, як вядома на шматлікіх прыкладах, суправаджаецца далучэннем да Еўрасаюза. Ды і нядаўні чэхаславацка-чэшскі прэзідэнт Вацлаў Гавел на старонках кіеўскага „Зеркала недели" выказвае амаль упэўненасць, што Беларусь у недалёкай будучыні далучыцца да еўрапейскай супольнасці. І калі так станецца, дык сумняваюся, ці нават сенатар Юргель прыдумае нам нейкае сховішча перад наступам басурманаў.

Аляксандр Вярбіцкі

Добрыя рады нашага бізнесоўца

— Не лезь у палітыку, займайся фальклорам, гэта табе лепш выходзіць, — пару гадоў таму даў мне такую параду адзін бізнесмен з нашых.

Сітуацыя была наступная. Той бізнесмен запалаў любоўю да Анджэя Лепэра. Запрашаў яго на нашу зямельку родную, карміў і паіў у сваім рэстаране. Пасля аднаго з такіх візітаў, калі Лепэр яшчэ і спатыкаўся з электаратам, паказаў я тую сустрэчу ў тэлебачанні. Бізнесмену тая мая справаздача не спадабалася, таму і параіў ён мне дзялянку, у якой — паводле яго — я сябе сама лепш рэалізую.

Мог бы і я свайму ментару даць падобную параду, бо на той час праяўляў ён актыўнасць на многіх нівах і ў яго быў яшчэ выбар. Але ён выбраў, выбачайце за каламбур, выбары. На жаль, выбаршчыкі выбралі не яго. Ды каб хоць уся ягоная сям'я за яго прагаласавала, то прынамсі рэзультат не быў бы такі жалю годны. А так адзін смех!

Пішу я гэта, аднак, не на тое, каб здзекавацца з чалавека, які прайграў. Дарэчы, яго парада была мне даспадобы. Я з прыемнасцю ездзіў бы на фэсты і юбілеі фальклорных калектываў. Вядома, лепш слухаць песні, чым бесталковую балбатню зграі нашых збаўцаў заадзінголас. На жаль, у нашым фаху ад палітыкі не ўцячэш.

Ну, дапусцім, заняўся чалавек культурай. Робіць спакойна рэпартажы з фэстаў, аглядаў і мастацкіх конкурсаў. Праца няспешная і ў цяпле. Палітыкаў і знаць не знае. Да часу! Да часу званка твайму шэфу са скаргай, што не паказаў Вельмі Важнага Госця на адкрыцці чагосьці-там, або не сказаў пра ролю пасла, войта ці раднага ў стварэнні ўмоў для свабоднага палёту натхнення над нашай прыгожай Беласточчынай.

Або, каб не займацца грэшнымі справамі дарослых, выбраў сабе спецыяльнасць: школьніцтва. Перад вачыма ніякіх вусатых і барадатых фізіяноміяў, ніякай схаванай пад грубым пластом пудры таямніцы. Адно вясёлыя вочкі, шчырыя ўсмешкі і румяныя шчочкі. Але паспрабуй забыць, хто дбае пра тое, каб гэтыя шчокі былі румянымі, а вочы вясёлымі! Або не дай Бог, пакажы не тых што трэба дзяцей. Уміг палічаны і спісаны будуць усе твае грахі і правіны! У першую чаргу зробяць гэта твае добразычліўцы, якія не прапусцяць ніводнага зручнага моманту, каб падставіць нагу.

Мой знаёмы бізнесмен — добразычлівец. Параіўшы мне заняцца фальклорам, жадаў мне адно дабра. У выпадку, калі б я сам сабе гэтага не жадаў і далей лез у палітычны тупік, дадаў: Chłopaki ci tego nie darują!

Каманда Лепэра зусім іншая ад тае з 2001-га. Тадышнія кандыдаты ў парламент не маглі простага сказа прачытаць перад камерай без памылкі. Цяперашнім нават пісаць не трэба. Каго там толькі і няма: бізнесмены, прафесары...

Хрэн з імі, тваімі хлапакамі! Каб чалавек браў у галаву ўсе такія перасцярогі і пагрозы, то лепш стаў бы пчаляром. Гэта, кажуць, прафесія, якая гарантуе даўгавечнасць. Забыўся і я на гэтых хлапакаў, як і на добрыя рады добрага чалавека. Да часу.

Старую размову прыпомніў мне іншы знаёмы. Калега, так сказаць, па фаху, які мае аўдыёвізуальную фірму. Як прадпрымальнік, прытрымліваецца ён старога рымскага прынцыпу, што грошы не смярдзяць. Выбарчая кампанія „Самаабароны" для яго, гэта залатая жыла. Сваю ролю ў кампаніі параўноўвае ён да тае, якую выконвае штатыў мікрафона ці камеры. Не перастае, аднак, думаць.

— Каманда Лепэра зусім іншая ад тае з 2001-га, — кажа ў прыватнай размове. — Тадышнія кандыдаты ў парламент не маглі простага сказа прачытаць перад камерай без памылкі. Цяперашнім нават пісаць не трэба. Каго там толькі і няма: бізнесмены, прафесары...

Я ведаю, каго няма. Майго анёла-добразычліўца!

Мікола Ваўранюк

Вачыма еўрапейца

Перад другой дзеяй

Нельга стрымацца ад думкі, што кіруючая Польшчай кааліцыя СЛД-УП трымаецца за ўладу як можа, любою цаной. На нішто розныя зандзіраванні грамадскай думкі, якія паказваюць, што крэдыт даверу вычарпаўся. На нішто расколы ў самім Саюзе і аднагалосная крытыка ўсяе апазіцыі, якая працівіцца спадарожнічаючым ад двух з паловай гадоў афёрам і скандалам, якая папракае ў нездзяйсненні дэкларацый і няўдалых рэформах, як хоць бы тая, што кранае ўсіх — аховы здароўя. На жаль, не лепшы ўвесь Сейм, кааліцыйны ды апазіцыйны — пасвараны, які займаецца перавытворчасцю законаў, якія вятраюцца да паправак м.інш. праз Канстытуцыйны трыбунал, Сейма, які мае цяжкасці са стварэннем большаснага ўрада.

Назіраў я з увагай за тым, што дзеялася ў апошні дзень пасяджэння Сейма, на якім быў (ня)вылучаны прэзідэнцка-кааліцыйны шэф урада праф. Марэк Бэлька. Гэта было жалюгоднае відовішча. У яго пралогу прэзідэнт, калі ўваходзіў у Сейм, аптымістычна кінуў у бок журналістаў: „Надзея памірае апошняй!"

Аж хацелася прыгадаць іншую прымаўку аб тым, чым для каго ёсць надзея. Пакуль што, прэзідэнцкая надзея трапіла ў спячку. Усе ў Сейме, акрамя кааліцыі, выказаліся не даваць вотуму даверу новай Радзе Міністраў і за ранейшыя выбары, найлепш восенню, а нават і ў жніўні.

Паколькі ўся дэбата транслявалася публічным тэлебачаннем, стала яна нагодай праявіць сябе, спробай урэшце паказацца паслам, якіх са свечкай не знойдзеш у штодзённым публічным жыцці краіны. Пытанні праф. Бэльку ставіла блізка восемдзесят асоб, і, наколькі я дакладна назіраў, выключна з апазіцыі. Большасць іх не магла змясціцца ў рэгламентнай адной хвіліне. Прысвячалі яе на ўступы, больш ці менш спраўныя аратарскія спробы прэзентацыі ўласных роздумаў. Нашто ўсё тое, калі ўжо раней было вядома, што прынамсі ў гэты пятнічны вечар (14 траўня) падтрымкі ў Сейме большаснай апазіцыі ўрад Бэлькі мець не будзе? Чаго ж пытацца, калі папраўдзе не чакаецца адказу? Ці так выглядае клопат за дабро краіны? І нашто ўвогуле гэткая першая дзея такога прадстаўлення? Заранёў было вядома, што Марэк Бэлька ў трэцяй карціне, пасля магчымай і вельмі пэўнай спробы сфармавання ўрада зноў будзе вылучаны прэзідэнтам. Тады хопіць яму звычайная большасць галасоў, якая лёгка даецца. Інакш прэзідэнт Аляксандр Кваснеўскі будзе прымушаны распусціць Сейм. Да такога эпілогу большасці дэпутатаў, таксама і той 60-цы, якая рупліва распытвала 14 траўня, зусім не спешна, незалежна ад самых розных дэкларацый. Паказалі гэта ўжо нядаўнія вынікі галасавання аб сеймавым самароспуску.

Пакуль што, антракт паміж першай і другой дзеяй працягваецца. Кабінет прафесара Бэлькі (які ў малой ступені персанальна адрозніваецца ад урада Лешка Мілера) выконвае свае абавязкі. І нават калі па няўдалай спробе ўтварэння ўрада Сеймам, Рада Міністраў пад кіраўніцтвам Марка Бэлькі будзе створана і пратрымаецца да вясны будучага года, то як можна разлічваць на сеймавую большасць пры ўстанаўліванні законаў, важных у першую чаргу для паправы сітуацыі ў дзяржаве? Усё паказвае на тое, што будзе гэта час вокамгненных саюзікаў, якія ў пакутах будуць прымаць рашэнні, пры яшчэ большай прыдзірлівасці апошніх, пры сумніўна-паспяховых высілках паправіць воблік СЛД і Сейма ў цэласці. Наступная дзея пастаноўкі — неўзабаве.

Мацей Халадоўскі

Беларускія майстры дакумента

„Кожнаму чалавеку Бог вызначае яго дарогу"
(Мікалай Гогаль)

У панядзелак, 26 мая 2003 г., я даведалася, што дзень раней памёр Мікалай Нестаровіч. Я ведала яго шэсць гадоў, ад хвіліны, калі прыехала ў Варшаву вучыцца на кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта. Тады мяне запрасілі на прэм'еру дакументальнага фільма, да якога фотаздымкі рабіў Мікалай Нестаровіч.

На чацвёртым курсе я вырашыла напісаць магістэрскую дысертацыю пра творчасць Тамары Саланевіч. З дапамогай прыйшоў мне Мікалай Нестаровіч — кінааператар большасці яе фільмаў. Лёс сутыкнуў іх пры рэалізацыі „Крэсавай балады". Я вырашыла падзяліцца з чытачамі „Нівы" эфектам маіх размоў. Наколькі я ведаю, гэта апошняе інтэрв'ю Мікалая Нестаровіча.

— Як успамінаеце Тамару Саланевіч, якой Яна была?

— Я нарадзіўся ў Орлі. Калі быў яшчэ малады, не прызнаваўся, хто я. Калісьці дзіўна глядзелі на праваслаўных прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей. Тамара заўсёды з паднесенай галавой гаварыла, што яна праваслаўная прадстаўніца беларускай меншасці, родам з Беласточчыны. Яна не толькі не саромелася, але ганарылася гэтым. Усе ведалі, хто яна і ставіліся да яе з пашанай. Яна ўмела ўсё растлумачыць, абараніць свае погляды і даказаць, што мае рацыю.

Людзі называлі мяне „Міколай", а яна заўсёды гаварыла да мяне „Коля", так, як называлі мяне ў Орлі.

Тамара ўсё сваё жыццё ахвяравала тэлебачанню. Не знайшла часу, каб упарадкаваць сваё асабістае жыццё. Не мела мужа, дзяцей, хаця не магла наракаць на недахоп зацікаўлення з боку мужчын. Была цыганскай прыгажосці — чорныя валасы, бліскучыя цёмныя вочы, смуглы твар — найпрыгажэйшай дзяўчынай ва універсітэце, а потым на тэлебачанні. Мела вялікую колькасць паклоннікаў. Я таксама быў крыху закаханы, аднак ніколі б нават не падумаў, што магу ў яе мець нейкія шанцы. Мы былі добрымі сябрамі.

Не выйшла замуж хіба з-за маці. Тамара выводзілася з багатай сям'і зямельных уладальнікаў і, відаць, маці хацела дачцэ адпаведнага мужа.

— Чаму Тамара Саланевіч занялася менавіта дакументальным фільмам?

— Спачатку я думаў, што калі буду рабіць мастацкія фільмы, буду „кімсьці", што дакумент гэта фільм горшай катэгорыі. Працуючы з Тамарай я зразумеў, што дакументальны фільм таксама вартасны. Тамара хацела рабіць нешта, што пакіне след, што будзе больш трывалым і сапраўдным, чым мастацкая кінастужка. Дакумент заўсёды пакідае след у гісторыі. Я пераканаўся ў гэтым намнога пазней чым Тамара. Можа менавіта таму Тамара занялася дакументам.

— Тамара атрымала многа ўзнагарод. Як да іх ставілася?

— Тамару вельмі часта запрашалі на фестывалі. Пачаткова яна ездзіла, высылала свае фільмы. Атрымлівала ўзнагароды. Было гэта тады, калі адносіны паміж людзьмі на тэлебачанні былі цёплыя і не было столькі зайздрасці, калі адзін аднаму не краў сцэнарыя, як гэта здараецца цяпер. Калі ўсё памянялася на горшае, Тамара перастала прымаць запрашэнні. Многа разоў яе прасілі, каб паказала „Жэртву", каб паехала ў Парыж. Прыслалі ёй нават запрашэнне і білет, хацелі, каб чытала там лекцыі, але яна не паехала. Ведала, што ўмее зрабіць добры і цікавы фільм. Гэтага ёй хапала.

— Колькі часу Тамара працавала ў Варшаве?

— Увесь час, толькі апошнія два гады працавала ў Беластоку, таму што адтуль бліжэй было да маці. З Беластока ў Нараўку недалёка. У Варшаве ўсе ведалі, што яе ніколі няма, што ўвесь час праводзіць з маці. Тады запрапанавалі Тамары працу ў Беластоцкім аддзяленні Польскага тэлебачання.

— Як думаеце, чаму Тамара працавала менавіта з Вамі?

— Тамара выбрала мяне, таму што ведала, што я буду гаварыць з людзьмі па-свойму і людзі будуць ведаць, што я свой чалавек, будуць больш даверлівымі. На жаль, не ўсе яе фільмы я мог здымаць, бо бывала і так, што ў гэтым самым часе я быў заняты, рабіў што іншае. Калі мы пачалі працаваць разам, тады ўжо стараліся гэтае супрацоўніцтва прадаўжаць.

Я добра ведаю гэтыя мясцовасці Беласточчыны, якія Тамара выбірала як план для сваіх фільмаў. Я хутка знаходзіў адпаведныя месцы для здымкаў, дзякуючы таму, што часта туды ездзіў, запамятаў асаблівыя месцы, гэта ж мае мясцовасці. Ведаю, дзе можна знайсці старэнькую хатку ці калодзеж з жураўлём.

Мы разумеліся з Тамарай без слоў, заўсёды ведалі ў чым справа.

— Я ведаю, што Вы здымалі фільмы не толькі для польскага тэлебачання.

— Сапраўды, здымалі таксама фільмы па заказу замежных тэлеканалаў Бі-бі-сі і Дыскаверы. У палове 1999 г. Тамара атрымала прапанову ад тэлеканала Дыскаверы зрабіць фільм пра татараў у Польшчы. Была шчаслівая. Зноў магла жыць атмасферай здымачнага плана. Фільм „Польскія татары" („Tatarzy polscy", 2000 г.) паўстаў дзякуючы супрацоўніцтву польскага і французскага тэлебачанняў, як адна серыя цыкла „Ginące cywilizacje". Польскі бок даў фільмавую групу, якая здымала і мантавала фільм, а ганарар плаціў французскі бок. Апрача гэтага французскае тэлебачанне згадзілася, каб польскае тэлебачанне бясплатна паказвала іншыя фільмы гэтага цыкла.

Тамара атрымала прапанову зняць фільм пра лэмкаў таксама для Дыскаверы, але ўжо не ўспела. Раней, у 1994 г., зрабіла фільм „Цярністы шлях" („Ciernista droga") для I праграмы Польскага тэлебачання пра лэмкаў менавіта. Лэмкі прынялі нас вельмі сардэчна. Даўжэйшы час ніхто пра іх не гаварыў. Тамара паказала сапраўднасць іх лёсаў. Лэмкі з вялікай асцярожнасцю падыходзілі да тых, хто хацеў рабіць пра іх фільмы. Нас там ніхто не ведаў, аднак яны ў нейкі спосаб адчувалі, што Тамара выслухае іх, зразумее гэтае, пра што ёй раскажуць. Гэта быў першы фільм, які праўдзіва паказаў іх лёс. Нас там ніхто не ведаў, аднак калі даведаліся, што мы гэта Тамара Саланевіч і Мікалай Нестаровіч, усё змянілася. Памятаю, што гэты фільм быў паказаны ў тэлебачанні а другой гадзіне ночы, хіба пасля двух гадоў ад рэалізацыі.

— Якая была рэакцыя Тамары на канчаткова змантаваны ўжо фільм. Ці заўсёды Ёй падабаўся, ці здаралася так, што нечага ў ім не хапала, што трэба нешта змяніць?

— Паводле мяне чалавек заўсёды мае ўражанне, што можна было зрабіць больш і лепш, што нават у канчатковай версіі можна нешта змяніць. Часам здаралася так, што паводле Тамары фільм быў ужо гатовы і раптам аказвалася, што трэба змяніць нейкія сцэны, нешта зусім выкінуць. Тамара вельмі гэта перажывала і была незадаволеная. Аднак ведала, што калі гэтага не зробіць, фільм не будзе дэманстравацца. Папраўляла, але з вялікай неахвотай.

У фільмах Тамары вялікую ролю адыгрываў пейзаж. Некаторыя гавораць, што адразу пазнаюць, што на здымках Беласточчына, і што гэтыя здымкі рабіў я. Чаму? Таму, што я ведаю спецыфіку гэтага пейзажу. Тамара заўсёды падкрэслівала, што мае адразу відаць, што на здымках Беласточчына. Пейзаж меў суіснаваць з цэлай драматургіяй фільма і з яго героямі. Фільм „Польскі падкідыш" („Polski podrzutek") здымалі ў Нараўцы, а чыгунку каля Бельска. Трэба было зняць сцэну, калі галоўная гераіня прыпамінае сабе Казахстан. Мы зрабілі так, што наша тэрыторыя імітуе Казахстан.

— А што рабілі, калі не было нейкіх важных рэквізітаў, а Тамара запланавала, што яны будуць патрэбныя?

— Тады хадзілі да людзей, прасілі, гаварылі, што нам патрэбнае, чаго шукаем і яны знаходзілі ўсё недзе ў сундуках. У нас быў свой плот з балясіны. Мы яго ўвесь час вазілі за сабою і ставілі дзе было трэба.

— Я ведаю, што Тамара рэгістравала Фестываль царкоўнай музыкі ў Гайнаўцы. Ці гэта знайшло адлюстраванне ў Яе фільмах?

— У большасці фільмаў Тамары чуваць вясковыя хоры. Паводле яе, такі спеў гучаў лепш, чым прафесіянальны хор, які спяваў з нот і які меў свайго дырыжора. Жанчын з вясковых хораў ніхто не вучыў. Яны проста адчуваюць гэтыя песні, спяваюць ад сэрца. Гэта натуральны, сапраўдны спеў, які стварае непаўторны клімат.

Тамара з вялікай павагай адносілася да праваслаўнага веравызнання і звязанай з ім культуры. Некалькі разоў рэгістрыравала Фестываль царкоўнай музыкі ў Гайнаўцы. Частым матывам у яе фільмах з'яўляюцца крыж, малітва, рэлігійныя спевы.

— Як ацэньваеце творчасць Тамары Саланевіч і сваё супрацоўніцтва з Ёю?

— Калі ўзяць пад увагу ўсё тое, што стварыла Тамара на працягу свайго жыцця, можна станоўча сцвердзіць, што ёю зроблена многа, арыгінальна і таленавіта.

Многа, таму што Тамара зрабіла больш чым трыццаць дакументальных фільмаў і рэпартажаў, у тым ліку адзін напаўдакументальны і напаўмастацкі фільм, вельмі важны і каштоўны ў яе творчасці — „Крэсавую баладу".

Арыгінальна, таму што фільмы Тамары адрозніваюцца ад гэтых, якія рабілі іншыя дакументалісты. Яна мела свае ўлюблёныя матывы: крыж; дарога, якая здавалася не мець канца; захад сонца; царкоўныя спевы; твары людзей паказаныя без ніводнага каментарыя. Знаўца яе творчасці ў адной хвіліне пазнае яе фільмы. Яны маюць свой непаўторны клімат, герояў-натуршчыкаў, якія расказвалі пра сваё заблытанае, цяжкае жыццё. У фільмах Тамары больш смутку і цярпення, чым радасці і смеху, так як у жыцці. Кожны герой іншы, у кожнага доўгая гісторыя жыцця, свае выключныя лёсы.

Таленавіта, таму што Тамара ўмела паказаць так многа розных тэм, а ўсё на вельмі высокім узроўні, умела заахвоціць да супрацоўніцтва на доўгія гады. Паводле мяне супрацоўніцтва з Тамарай было канкрэтнае. Яна ведала, чаго патрабаваць ад сябе і ад сваіх „акцёраў", таму што яна мела пачуццё тэмы, якое яе ніколі не падвяло.

— Вельмі дзякую.

Гутарыла Анна Дэмянюк

Наракаюць

Давялося мне пабываць у многіх вёсках усходняй Беласточчыны. Усім, з кім я сустракаўся, ставіў аднолькавае пытанне: „Калі было лепш жыць — пры камуне ці цяпер, пры дэмакратыі і рыначнай эканоміцы?" Жыхары тых вёсак ведаюць мяне як карэспандэнта „Нівы" і, вядома, калі аб нечым распытваю, дык напэўна напішу. Прасілі, каб не выяўляць іхных імёнаў і прозвішчаў у газеце.

Гутаркі амаль у кожнай вёсцы паўтараліся аднолькава: — Бачыш, Коля, закрылі нам чыгунку і няма на чым дабрацца ў горад, абмяжоўваюць аўтобусныя маршруты і ў выніку цяжка даехаць да лекара, у гміну, а нашым дзецям цяжка прыехаць з горада праведаць нас ды што-небудзь дапамагчы. Калі нам у сакавіку павысілі ў сярэднім на 8 зл. пенсіі, то цэны харчовых прадуктаў і тавараў павысілі намнога больш, і ў рэзультаце мы сталі яшчэ бяднейшымі. Няма куды звярнуцца за дапамогай. Кожны толькі пільнуе свайго *крэсла*, а пра дзяржаву нічога не дбаюць. Калісь, пры камуне, хоць менш было тавараў, але цэны былі стабільныя і аднолькавыя так у забітым дошкамі закутку, як у Варшаве. Кожны грамадзянін ведаў што колькі каштуе і яго цяжка было ашукаць, а цяпер — некалькі аб'язных крамаў у вёску прыязджае і ў кожнага прадаўца іншыя цэны, ды намнога даражэй прадаюць чым у гарадскіх крамах і горшай якасці тавар, — так пераважна гаварылі ўсе мае суразмоўцы.

Казалі таксама, што будуць галасаваць за сапраўднай кумунай, а калі прыйдзецца падымаць руку — то кожны падыме абедзве рукі ўгару. Трэба каб над гэтым сур'ёзна задумаліся нашы паслы і прынялі адпаведныя меры, каб ліквідаваць у краіне ценевую эканоміку.

Мікалай Лук'янюк

Каму праца?

Калі ў 1997 годзе ў Чаромсе арганізаваўся пратэст супраць уезду аўтафураў, войт гаварыў: „Забарона заязджаць аўтафурам у Чаромху абазначала б закрыць, або перанесці аддзяленне мытнікаў у Кляшчэлі, Бельск ці Гайнаўку, а тым самым страціць шанц на новыя месцы працы, якіх нам не хапае".

У сакавіку г.г. на пагранічны пераход у Полаўцах патрабавалася васемнаццаць мытнікаў. У Беласток паступіла больш за дзвесце заяў. Многія былі з Чаромхі. У выніку рэкрутацыі было прынятых з пасёлка чатыры ці пяць асоб. Апошнія — з Гайнаўкі ды Бельска-Падляшскага. Чым кіравалася камісія ў Беластоку пры падборцы кандыдатаў? Інтэлігенцыяй, фізіяноміяй, прафесійнымі ведамі? А мо іншымі фактарамі, бліжэй невядомымі звычайнаму чарамшаніну. З таго, што мне вядома, усе кандыдаты мелі вышэйшую адукацыю, а некаторыя з іх прафесійную падрыхтоўку. Гэтых апошніх якраз не папрасілі на размовы. Чаму? На гэтае пытанне зможа адказаць адно дырэктар мытнай управы ў Беластоку.

(ус)

У будучыні хацелі б мы вярнуцца на Гайнаўшчыну, бо тут спакойна і свойска. Тут нашы культура і карані. Толькі каб працу можна было знайсці, — заявілі сёлетнія матурысты...

Па старых прынцыпах

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Перад экзаменам па беларускай мове белліцэісты былі ў добрым настроі

Апошні раз 122 вучні Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы з 11 па 13 мая пісалі экзамены на атэстат сталасці паводле старых прынцыпаў. Хаця па беларускай мове не было тэмаў, да якіх вучні рыхтаваліся загадзя, то большасць ліцэістаў задаволены былі прапанаванымі тэмамі. Радаваліся „старой матуры", якую лягчэй здаваць.

У час экзамену па беларускай мове найбольш ліцэістаў рашылася пісаць на першую тэму: „Думаць усюды аб народзе, родны край усюды сніць (Цётка). Прывядзі прыклады твораў беларускай літаратуры, якія даводзяць слушнасці гэтых слоў". Многа вучняў пісала на другую тэму: „... Нашто ж на зямлі / Сваркі і звадкі, боль і горыч, / Калі ўсе мы разам ляцім / Да зор? (М. Багдановіч). Звярніся да ўсіх людзей планеты з заклікам пераадолець варожасць, кінуць «сваркі і звадкі», імкнуцца да еднасці і братэрства паміж людзьмі". Толькі некаторыя асобы рашыліся пісаць на трэцюю тэму: „Выкажы свае думкі і рэфлексіі, якія наводзіць на цябе верш Рыгора Барадуліна «Каўчэг» (верш быў надрукаваны пад тэмай).

З экзамену па беларускай мове звольнены былі лаўрэаты і фіналісты Алімпіяды беларускай мовы. Аднак і яны прыйшлі ў школу і правялі сяброў у гімнастычную залу, дзе праходзілі экзамены.

Можа нават больш за вучняў хваляваліся іх бацькі, якія з самой раніцы ліцэістам і экзаменацыйнай камісіі падрыхтавалі бутэрброды.

— Колькі ж разоў мне хвалявацца за матуральны экзамен. Спачатку сама здавала, пасля перажывала за дачку, а зараз сын піша, — заявіла Зоя Кулік.

Іаанна Врублеўская, Ева Кот і Ева Галавачык, як пераможцы беларускай алімпіяды, былі звольнены з апошняга пісьмовага экзамену. Аднак хваляваліся за экзамены, якія пісалі папярэднімі днямі. Іаанна Врублеўская закончыла вучобу з сярэдняй ацэнкай 5,2 бала. Сказала, што здольнасці да вучобы па матэматыцы і фізіцы дасталіся ёй па бацьках. Найбольш вучылася па мовах і гуманітарных прадметах.

— І ўсё ж нервы з'елі на матэматыцы, — заявіла Іаанна Врублеўская. — Збіраюся паступаць у Варшаўскі універсітэт і вучыцца ў парадку MISH (вучоба на выбраных спецыяльнасцях), куды як лаўрэатка магу паступаць без экзаменаў. Планую выбраць дзве спецыяльнасці — эканомію і псіхалогію рынку. Рашылася на эканомію, бо люблю матэматыку, цікаўлюся таксама псіхалогіяй.

Вучні, якія пачалі выходзіць з экзамену па беларускай мове, абмяркоўвалі свае пісьмовыя работы.

— Я пісала на першую тэму і абапіралася на творчасць Васіля Быкава, Максіма Багдановіча, Наталлі Арсенневай і Ларысы Геніюш. Люблю Максіма Багдановіча, а творы іншых пісьменнікаў таксама падыходзілі да выбранай мною тэмы. Арсеннева і Геніюш жылі на эміграцыі і тужылі па радзіме, — сказала Анна Герасімюк. — Рыхтаваліся мы пісаць пра беларускую культуру ў Польшчы і творчасць нядаўна памерлага Васіля Быкава. Не было такіх тэм, але творчасць апошняга пісьменніка можна было выкарыстаць у маёй працы.

— Ад школьнага жыцця застануцца прыемныя ўспаміны. Асабліва сімпатычны быў наш настаўнік па беларускай мове Ян Карчэўскі, які патрапіў зацікавіць сваім прадметам. У будучыні хацелі б мы вярнуцца на Гайнаўшчыну, бо тут спакойна і свойска. Тут нашы культура і карані. Толькі каб працу можна было знайсці, — заявілі Анна Герасімюк і Каміля Палічук.

— Я выбраў трэцюю тэму — найбольш канкрэтную. Рыхтаваўся я пісаць інтэрпрэтацыі на вершы, а твор Рыгора Барадуліна паказаўся цікавым, — сказаў Марк Пракапюк, які збіраецца паступаць на англійскую філалогію.

— Будзем добра ўспамінаць нашу настаўніцу па беларускай мове Іаланту Грыгарук, якая дбала пра нас, як маці. Бывала, што нашы справы ставіла вышэй, чым свае асабістыя, — сказалі дзяўчаты з IV „д" класа.

Многія белліцэісты збіраюцца паступаць на тэхнічныя і эканамічныя спецыяльнасці або вучыцца заходнім замежным мовам. Некаторыя рашыліся паступаць на беларускую філалогію.

(ам-з)

АДКРЫТЫ ЛІСТ

16 траўня 2004 г., г. Менск

Сп. Леаніду КАРАВАЙКУ,

Генэральнаму Консулу Рэспублікі Беларусі ў Беластоку

Вельмішаноўны спадар Генэральны Консул,

Я шчыра крануты Вашым клопатам пра беларусаў Беласточчыны, пра які так цёпла распавяло Беларускае тэлебачаньне сёньня, 16 траўня. Польшча — новая краіна Эўрапейскага Зьвязу — дае магчымасьць беларускай этнічнай меншасьці выхоўваць і вучыць дзяцей на роднай мове, але ўсё роўна існуе патрэба ў разнастайнай дапамозе. І Вы дапамагаеце беларускім дзіцячым садкам і школам у Польшчы чым можаце: кнігамі, арганізацыяй экскурсіяў і інш. Такая дапамога вельмі патрэбная нашым суродзічам ва ўсіх суседніх, дый далёкіх, краінах. Такая дзейнасьць цалкам адпавядае і Праграме Партыі БНФ, якую мне даверана ўзначальваць.

Маю да Вас, вельмішаноўны спадар консул, вялікую просьбу. Вы добра ведаеце, што 150 навучэнцаў Нацыянальнага гуманітарнага ліцэю — адзінай навучальнай установы ліцэйскага тыпу ў Беларусі й адзінай сярэдняй школы ў Менску, дзе ўсе прадметы выкладаліся па-беларуску, — апынуліся на вуліцы, бяз школы, безь беларускіх падручнікаў, без гарантаванай магчымасьці атрымаць адпаведны атэстат. Адзіны беларускі ліцэй рашэньнем уладаў зьлікідаваны. Дзеці ў сталіцы Беларусі вучацца па-беларуску падпольна, на прыватных кватэрах.

Кнігі, па якіх дзеці вучыліся, засталіся ў будынку ліцэю. Ён пустуе, але ані вучыцца там, ані кнігі забраць адтуль нельга: будынак ад нас ахоўваюць. Таму прашу Вас, добры чалавеча: дапамажыце і нашым дзецям хаця б беларускімі падручнікамі.

Загадзя дзякую,

З павагай

Вінцук Вячорка, бацька ліцэіста

Кірылічны друк

14 мая ў Беластоцкім універсітэце адбылася навуковая канферэнцыя прысвечаная праваслаўным выдавецтвам у Рэчы Паспалітай з удзелам вучоных з вядучых польскіх навуковых цэнтраў.

З'яўленне друку на заселеныя праваслаўнымі абшары Рэчы Паспалітай наступіла ў 20-х гадах XVI стагоддзя, а ягоным першапачынальнікам быў Францішак Скарына. Але яшчэ да яго кірылічныя кнігі — „Актоіх" і „Часаслоў" ды дзве трыодзі — выйшлі ў друкарні Швайпальта Фіоля ў Кракаве каля 1491 года — амаль сто гадоў пасля першага друку Гутэнберга; да таго часу ў Рэчы Паспалітай выйшлі ўжо лацінскія (1445 г.), яўрэйскія (1475 г.) і грэчаскія (1476 г.) друкі.

Пра Скарыну, пра якога, бадай, шмат вядома, на канферэнцыі многа не гаварылася. Варта мо толькі згадаць, што мецэнатную падтрымку атрымаў ён з боку віленскіх мяшчан. І хаця друкаваныя ім кнігі былі прысвечаны рэлігійнай тэматыцы, тадышняя Царква не была імі зацікаўлена — Царква супрацьстаяла ўсялякім пераменам. Дарэчы, пранікненне хрысціянства на тэрыторыю Вялікага княства Літоўскага адбывалася дзякуючы менавіта мецэнату; напр. яшчэ ў рукапісны час вядомай мецэнаткай рэлігійнай творчасці была княгіня Ефрасіння Полацкая.

Мецэнат быў адной з праяў попыту на друкаваную літаратуру, а выдаўцы таксама працавалі мэтанакіравана, арыентуючыся на канкрэтныя асяроддзі патэнцыяльных чытачоў, напр. трыодзі былі намечаны духавенству, а „Малая падарожная кніжка" — купцам.

Буйнейшае развіццё кірылічнага — у Вялікаім княстве Літоўскім — кнігадрукавання супала з канфесійным супрацьстаяннем перыяду Брэсцкай уніі і звязанай з ім палемікай. Важным стымулам у гэтым напрамку была кніга езуіта Пятра Скаргі „Пра адзінства хрысціян і грэчаскае ад яго адступленне" (1576 г.). Палемікі ў той час адбываліся не толькі словам на старонках кніг, але і чынам, калі „палемісты" палілі кнігі сваіх праціўнікаў. А бывала і так, што заступнікам некаторых ідэй трэба было канспіравацца, ды і друкарам таксама галовы патрэсківалі. Здаралася часта, дзеля прадухілення ад праследаў, што друкары палемічных тэкстаў паказвалі на сваіх кнігах несапраўдныя месца і час друку. Паказальны тут і прыклад віленскіх друкароў, якія надрукаваўшы антыуніўныя выступленні Мялеція Смятрыцкага вымушаны былі пакінуць Вільню і перабрацца ў Еўе.

Цікавы быў таксама лёс і чыста багаслоўскіх кніг. Пасля далучэння Уніяцкай царквы да Праваслаўнай у 1839 годзе, старыя рэлігійныя кнігі апынуліся ў ролі непатрэбных, часта пад пылам на гарышчах. І вось гэтыя старыя выданні, што былі ва уніяцкіх руках, адкуплялі стараверы, якія і данеслі іх да нашых дзён; такім чынам захаваліся м.інш. „Евангелле" Цяпінскага і „Астрожская Біблія".

У „Эклезіясце" слаўны мудрасцю цар Саламон напісаў: „Што было, тое і будзе; і няма нічога новага на свеце". Пра традыцыйныя ганенні на друкаванае слова на найбліжэйшай нам тэрыторыі былога Вялікага княства Літоўскага згадваць не буду. Адно заўвага да накіраванай на праваслаўе канферэнцыі: ад Царквы крышку пасядзеў на ёй архімандрыт Гаўрыіл. А было пра што паслухаць; праўда — можна будзе пра гэта пачытаць, бо матэрыялы канферэнцыі пра друк выйдуць у верасні г.г. — друкам.

(івар)

У Белавежы чакаюць турыстаў

У Белавежы (Гайнаўскі павет) прыватныя ўласнікі пабудавалі тры новыя гасцініцы на 400 начлежных месц. Яны плануюць павялічыць яшчэ начлежную базу на 200 ложкаў, а таксама пабудаваць купальныя басейны, тэнісныя корты, трэнажорныя залы, кегельбаны (да гульні ў кеглі) ды салоны біялагічнага абнаўлення.

Зараз новую гасцініцу на 72 начлежныя месцы ўзводзяць па вул. Вашкевіча. Разбудоўваюць існучюы гасцінічны комплекс на 98 ложкаў па вул. Крыжы (тут будзе і купальны басейн, і зал атлетычнай гімнастыкі, і кегельбан). Па гэтай вуліцы запланавалі гасцініцу на 70 начлежных месц ды з двума тэніснымі кортамі. Ідзе пабудова трох дамоў з начлежнымі месцамі па вул. Новай і пансіяната па вул. Каляёвай.

Варта дадаць, што ў Белавежы дзейнічае ўсё больш і больш прыватных турыстычных бюро.

Мясцовыя жыхары адкрываюць пансіянаты (невялікія гасцініцы з утрыманнем), яны вядуць шмат турыстычных гаспадарак. У прыватных дамах і ў прыватных дачных доміках у Белавежы ёсць восемдзесят начлежных месц, у Тэрамісках і Чарлянцы — па васемнаццаць ды ў Пагарэльцах — дзевяць. Усе, хто займаецца турыстыкай, адкрылі пункты пракату веласіпедаў і байдарак, прапануюць настольны тэніс. Некаторыя, апрача агратурыстычных кватэр займаюцца вытворчасцю ўсялякіх рэгіянальных вырабаў (распаўсюджана м.інш. разьба па дрэву), маюць свае пасекі і наладжваюць дэгустацыю мёду, займаюцца рыбагадоўляй у ставах, гадуюць коней і прапануюць турыстам прагулкі брычкамі па бліжэйшай прыгожай ваколіцы. Гаспадыні ахвотна навучаць пячы хлеб ды пірагі ў вясковых печах ды распавядуць пра лекавыя зёлкі, якіх тут мноства ад усялякіх хвароб.

Наведаў я Белавежу і навочна пераканаўся ў тым, што сёлетні турыстычны сезон ужо пачаўся. Сюды прыязджаюць турысты, не зважаючы нават на дажджлівае надвор'е.

Янка Целушэцкі

Аб меншасцях без іх

Еўрасаюзная тэматыка загасцявала не толькі ў сродках масавай інфармацыі. Гэтай тэме прысвячаюцца фэсты і рознага роду мерапрыемствы, семінары, напрыклад, спатканне, якое адбылося 7 мая ў Доме культуры „Захэнта" ў Беластоку. Арганізатары Рускае культурна-асветнае таварыства і „Малады цэнтр" правялі семінар пад прыгожай назвай: „Спаткаймася ў адным доме. Меншасці ў Еўропе".

Галоўнымі мэтамі спаткання было ўказанне шанцаў, якія стаяць перад Польшчай у структурах шматкультурнага Еўрасаюза, азнаямленне меншасцей з еўрапейскім заканадаўствам, стварэнне падляшскай мадэлі супрацоўніцтва меншасцей з польскай „большасцю", і, найважнейшае, перакананне іх да ўдзелу ў выбарах у Еўрапейскі парламент. На жаль, ніводная з прадугледжаных арганізатарамі мэтаў не была поўнасцю дасягнута. Паўплывалі на гэта ўдзельнікі семінара, якімі ў 80% былі вучні гімназій і ліцэяў. Маладыя людзі мелі праблему не толькі з двухгадзіннай пасядзелкай у аўдыторыі, але і з разуменнем выступоўцаў.

Праграма спаткання была цікавай, аднак, на жаль, не прыступнічалі ў ім найбольш зацікаўленыя — меншасці. Цікавым быў даклад Анджэя Кузьмы, які прадставіў адносіны праваслаўя да Еўрасаюза і Міхала Клінгера аб грамадскіх, этнічных і рэлігійных правах меншасцей у еўрапейскіх дэмакратыях.

Незразумелым для вучняў аказалася выступленне Артура Кузняцова з Расійскага пасольства, які на рускай мове прадставіў тэму „Расія і Еўрасаюз". Даклад адрозніваўся ад папярэдніх не толькі мовай, але і зместам. Артур Кузняцоў, як адзіны з выступаючых, не расхвальваў уваходу Польшчы ў ЕС, толькі папярэджваў, што сапраўдныя праблемы пачнуцца вельмі хутка. Павышэнне цэн, малыя заробкі, беспрацоўе і бесперспектыўнасць на паляпшэнне будучыні — гэта толькі некаторыя з праблем. Абумовіўся аднак, што нягледзячы на гэта Расія хоча і напэўна будзе ўтрымліваць добрыя суадносіны як з Польшчай, так і Еўрапейскім Саюзам.

„Большую меншасць у перспектыве Еўрасаюза" — значыць пазіцыю польскай Каталіцкай царквы — прадставіў ксёндз Тамаш Хлябоўскі, які, спасылаючыся на навуку папы рымскага, гаварыў аб ролі, якую адыграць павінны веруючыя палякі ў ЕС.

Няёмкасць, а ў некаторых момантах смех, выклікала выступленне Марка Лібэрадзкага — упаўнаважанага падляшскага ваяводы па справах меншасцей. Прамоўца з перакананасцю гаварыў, што ў нашым ваяводстве, а нават ва ўсёй краіне, меншасці маюць так добрую і ясную сітуацыю, што не павінны наракаць. Колькасць старанняў і грошай, якія прызначаюць меншасцям ваяводскія ўлады, колькасць меншасных мерапрыемстваў можа толькі выклікаць зайздрасць польскай большасці.

Калі гаворка сышла на Закон аб нацыянальных меншасцях, які яшчэ ляжыць у Сейме, а аб якім меў гаварыць пасол Яўген Чыквін, які не паявіўся на семінары, пачуць можна было словы, так ад некалькіх пенсіянераў прысутных на спатканні, як і ад выступаючых, „што і без гэтага закону якась жыць можна, а пачакаць трэба". Можа і праўда. Меншасці чакалі яго 10 гадоў, дык пачакаюць яшчэ...

Пасля такога тыпу семінара паўстаюць два пытанні: да каго быў накіраваны семінар, і хто мае карысць ад яго? Незацікаўленыя, маркотныя вучні ці арганізатары? Бо, напэўна, не меншасці. А да арганізатараў мая заўвага: не карыстайцеся больш нацыянальнымі меншасцямі ў ходзе выбарчай кампаніі!

Паўліна Шафран-Асташэвіч

У Кляшчэлях

У народзе кажуць: „У траўні дождж і гром лепшы чым аграном". Сяголета надвор'е паспрыяла. Вясна мокрая. Азіміна расце быццам на дражджах. Трава на сенажацях таксама. З лугамі ў нізінах праблема. Вада залівае. Сенакосы пазней будуць, але ўраджай нядрэнны прадбачваецца.

Задумаў я ў панядзелак паехаць на рынак у Кляшчэлі пацікавіцца цэнамі пры „еўрасаюзе" і знаёмых наведаць. Травеньская раніца была халоднай, ветранай і дажджлівай, таму ў падарожжа адправіўся я на цягніку. З кляшчэлеўскай станцыі падаўся да Яна Бадаўца, вядомага ў наваколлі печніка. Ён мне сушылку для грыбочкаў зрабіў. Гаспадара я не застаў у хаце.

— У Грабавец паехаў. Ад заказчыкаў дзверы не закрываюцца, — заяўляе Надзея Бадавец, жонка майстра.

На рынак ад спадарства Бадаўцоў як рукой падаць. Праходжу панадворкам колішняй школы. Адна руіна, вокны разбітыя быццам пасля нейкай бітвы. Няўжо радных не цікавіць лёс апусцелай маёмасці?

Рынак забіты трактарамі ды аўтамабілямі. Найлепш прадаваліся парасяты — 200-250 зл. за парку. Бульба танна цанілася. Пакупнікоў не было. Два аўтамабілі скупкай займаліся. Па 15-17 зл. за цэнтнер плацілі. І збожжа скуплялі на грузавых аўтамабілях. З іншых рэгіёнаў Польшчы прыехалі. За жыта плацілі па 38 зл. за цэнтнер, а на другім па 40 зл. За сырадэлю селянін прасіў па 4 зл. за кілаграм, а за грэчку па залатоўцы. Найбольш прадавалася расада памідораў, капусты, парэю ды сельдэрэю па 80 гр. за штуку.

У гміне пагаварыў я з бурмістрам пра сацыяльную дапамогу.

— Прымаем заявы на сацыяльную ўспамогу ад патрабуючых, — заявіў Аляксандр Сяліцкі. Не ведаем колькі просьбітаў будзе. Але мы да гэтай рэформы адпаведна падрыхтаваны і лічу, што не будзе праблемы з афармленнем дакументаў як і выплатай грошай.

— А як з беспрацоўем? — цікаўлюся.

— Менш, чым у сярэднім у павеце, значыцца, каля трынаццаці працэнтаў...

Адпраўляюся на станцыю. Дождж не спыняецца, а пачакальня забітая бляхай. Няма дзе схавацца. Амаль дваццаць мінут вымушаны я быў прастаяць пад адкрытым небам. Але гэта, пэўна, не хвалюе чыгуначных начальнікаў у Беластоку.

Уладзімір Сідарук

Заўсёды з „Нівай"

У 17 н-ры „Нівы" ад 25 красавіка г.г. прыемна ўразіў мяне допіс Мікалая Панфілюка, у якім ён вельмі цёпла выказваецца аба мне. Калі я пайшоў на пенсію, то думаў, што ўжо нікому непатрэбны. Нейкі час перастаў нават пісаць у „Ніву", пакуль не сустрэўся з былымі ды цяперашнімі яе працаўнікамі. Яны заахвоцілі мяне вярнуцца на старонкі роднай „Нівы". Мікалай Панфілюк працуючы пісьманосцам быў актыўным прапагатарам і карэспандэнтам „Нівы", намнога больш працавітым ад мяне. Калі адышоў на заслужаную пенсію, таксама на нейкі час спыніў супрацоўніцтва з рэдакцыяй. Але ўжо прайшлі крызісныя хвіліны для мяне і М. Панфілюка і мы зноў сустракаемся на старонках „Нівы".

Мікалай Лук'янюк

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Ужо не першы раз ладзяцца ў Беларускім садку н-р 14 у Беластоку абрадавыя пастаноўкі. Гэта амаль ужо дзесятак гадоў, як бацькі (якія і складалі сцэнарый абрадавых пастановак), настаўніцы ды дзеткі паказваюць, як „ад абраднасці даходзім да тоеснасці". Не толькі самім сабе, але і калегам з польскіх груп, дзядулям і бабулям (не толькі сваім — ездзілі ў госці да самотных бабуль і дзядуль, што жывуць у дамах апекі), у дамах культуры, на конкурсах і ў іншых школах. Старэйшыя акцёры з дзяцей — ужо гімназісты і вучні перш за ўсё ПШ н-р 4 у Беластоку, але захавалі ў добрай памяці тое, як святкавалася ў нас калісьці.

На пастаноўку „Каравай і паненскі вечар", якую падрыхтавалі пяці- і шасцігодкі, прыбылі сябры, малодшыя групы, настаўніцы польскіх груп, бабулі з дзядулямі, прадстаўніца Кураторыі асветы ды сам консул Рэспублікі Беларусь. Рыхтавалася якраз вяселле Олечкі, якая, хоць у гэты дзень хворая, не магла адмовіцца ад выступлення. Мама Дзямяна Цыванюка зрабіла новыя вяночкі дзяўчатам, а іншыя мамы і таты, разам з выхавацелькамі Аняй, Евай і Эляй ды дзецьмі спраўна паказалі красу і адметнасці падляшскага гібання каравая і жарты, спевы ды танцы на паненскім вечары. Усё гэта адбываецца перад вяселлем. Выступілі Аня Аляксейчук, Міколка Цішук, Алінка Варшыцкая, Дзямян Цыванюк, Паўлік Гаінскі, Аляксандра Конюх, Дарыя Вапа, Міхась Саковіч, Куба Макарэвіч, Матэвуш Далінскі, Юстына Апольская, Дарка Дажынка, Юліта Тымашэвіч. Дружкі і дружбанты весяліліся, перамаўляючыся жартаўліва, зачапаючы таксама і маладога, быццам бы можа ён і гультаяваты (не можа ж быць!), танцавалі між іншым „Лявоніху". Спечаным караваем (які смачны, пухкі быў!) пачаставаліся ўсе — і стомленыя акцёры, і захопленая публіка. Захопленая тым больш, што выступілі таксама нядаўнія лаўрэаты конкурсаў — Аня Аляксейчук і Паўлік Гаінскі — лаўрэаты гарадскога конкурсу калыханак, Дарка Вапа, Юстына Апольская і Магдаліна Бабік — дэкламатаркі. Малайчыны! А Паўлік, якога тата Лешак ды мама Ася танцуюць у „Курпях Зялёных" (тата здатна падмацоўвае ансамбль бацькоў), палякі, асабліва могуць цешыцца дасканалым маўленнем сынка — рэдка каму так удаецца, як Паўлу, сказаць „л"!

Сёлета сярод малечаў — меншай групы — аж 27 асоб. На іх ды на іхных бацькоў паглядала спадарыня дырэктарка: неўзабаве і яны будуць выступаць „як старыя", вопытныя, звыклыя са сцэнай ды камерай мастакі.

Міра Лукша

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Паўлік Гаінскі, якога тата Лешак ды мама Ася танцуюць у „Курпях Зялёных"

Каравай у садку

Вершы Віктара Шведа

Няма патрэбы купляць грэбень

— Чаму ты раскудлачаны пагана? —
Настаўнік запытаў Сцяпана.
— Я грэбеня ніякага не маю,
Таму так непрыстойна выглядаю.

— Купіць ты, дружа, грэбень гэты можаш,
І тады будзеш выглядаць прыгожа.
Адказ на гэта быў тут нечаканы:
— Прычэсвацца я б мусіў пастаянна.

Пазыч мне сшытак

Сусед пастукаў да суседа:
— Так вельмі хочацца мне ведаць,
Ці ўжо рашыў ты сыну Ваню
Па матэматыцы заданне?

— Так, рашыў я паспяхова
І, думаю, беспамылкова.
— Дык ты пазыч мне сшытак сына,
Адпіша хай мая Галіна.

Магда Саковіч

Мама

Мама — малое слова,
а колькі значыць у маім жыцці.
Мама навучыла мяне гаварыць,
хадзіць і разумець свет.
Мама як іскра,
якая свеціць удзень і ноччу.
Пры маме цёпла,
утульна і бяспечна.
Мама заўсёды дапаможа
і ніколі не адмовіцца.
Пра маму можна пісаць без канца,
праз стагоддзі,
але і так усё гэта не змесціцца
на мільёне старонак.

Адмірал і яго каманда

Блакітнік

Сярод вядомых мне вершаў, прысвечаных матылькам, гэты верш — адзін з самых узнёслых і дасканалых. Я запомніў яго даўно, яшчэ калі быў няўрымслівым шкаляром. Спадзяюся, вы таксама не забылі радкі, напісаныя Максімам Багдановічам:

Па-над белым пухам вішняў,
Быццам сіні аганёк,
Б'ецца, ўецца шпаркі, лёгкі,
Сінякрылы матылёк.
Навакол усё паветра
Ў струнах сонца залатых, —
Ён дрыжачымі крыламі
Звоніць ледзьве чутна ў іх.

Які цудоўны паэтычны малюнак! Адразу, быццам наяву, перад вачыма паўстае веснавы, сапраўды святочны дзень. Калі навокал смяюцца кветкі, спяваюць птушкі, танцуюць матылькі...

„А вось цікава, — неяк падумалася мне, — якога дакладна з матылькоў прыкмеціў паэт «па-над белым пухам вішняў»?"

Паразважаўшы, я прыйшоў да наступнай высновы.

Максім Багдановіч хутчэй за ўсё меў на ўвазе блакітніка. У нас на Беларусі сустракаюцца блакітнік прыгожы і блакітнік серабрысты. Абодва матылькі невялічкія памерам і распаўсюджаны. Асабліва там, дзе цвіце канюшына ці люцэрна. Дарэчы, побач з блакітнікамі пырхаюць і цёмна-бурыя матылёчкі. Так сціпла ў параўнанні з самцамі пафарбаваны іх самачкі.

Дык няхай жа заўсёды матылькі звоняць „у струнах сонца залатых"! На радасць усім добрым людзям, а найперш — дзецям.

Уладзімір Ягоўдзік

Польска-беларуская крыжаванка № 21

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 17: Манер, хор, пава, саган, порт, вясёлка, толк, самка, мяч. Шах, мята, нос, сом, перапёлка, голка, парк, фантазія, красавік.

Узнагароды — „магічныя" фламастэры — выйгралі: **Марта Каліноўская** і **Наталля Сцепанюк** з Беластока. Віншуем!

Дарагая „Зорка”!

Пішуць Табе вучаніцы VI „ц” класа Пачатковай школы н-р 4 у Беластоку. На ўроках беларускай мовы мы гаварылі пра нашы ўлюбёныя тэлепраграмы і фільмы. Пераважная большасць з нас любіць фільм „К як каханне” („M jak miłość”) і тэлетурнір для вундэркіндаў (Dzieciaki z klasą). На занятках мы глядзелі фільм „Шрэк”. Ён нам усім вельмі падабаецца. Настаўніца загадала нам напісаць рэцэнзію на гэты фільм. Вось нашы сачыненні.

Мне вельмі падабаецца фільм „Шрэк”, таму што ён вельмі смешны і многа ў ім песень. Думаю, што ён вельмі павучальны і разумны. Не паказвае дурнотаў, а сапраўднае, звычайнае жыццё... агра. Фільм вучыць нас карыстацца прыроднымі багаццямі — свечка з вашчыны. Вучыць, што кожнаму чалавеку патрэбны сябар і кожны павінен дапамагаць іншым людзям.

Аня Яканюк

Фільм „Шрэк” расказвае пра займальныя падзеі з жыцця зялёнага агра-Шрэка, асла і прынцэсы Фіёны. Дзея адбываецца ў часах, калі прынцэсы чакалі сваіх прынцаў у недаступных замкавых вежах. Замкаў тых часта баранілі смярдзючыя серкай драконы або, як у фільме „Шрэк” — драконшчыцы. У фільме мы назіраем за ўсімі прыгодамі Шрэка на ягонай дарозе са свайго дому ў палац дурнога прынца Фаркуада. Пра таго прынца лепш тут і не ўспамінаць, але фільм сапраўды варты таго, каб паглядзець яго не адзін раз.

Оля Максімюк

Я ўжо некалькі разоў глядзела фільм „Шрэк” і за кожным разам ён мне вельмі падабаецца, хаця кожны яго момант я добра ведаю. Думаю, што „Шрэк” гэта самы лепшы фільм. Ёсць у ім моманты няўпэўненасці, але і смешныя моманты. У фільме выдатныя графіка і дыялогі. Самы смешны герой фільма — асёл, які любіць многа гаварыць, да таго смешна. Я з нецярплівасцю чакаю наступных частак гэтага фільма.

Магда Саковіч

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Дэкламатары з Залук з настаўніцай Яўгеніяй Грушэўскай

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Рэдакцыя „Красавіка”

Імёны жывёл

Размова з АННАЙ НЕВЯДОМСКАЙ, жыхаркай Дубіч-Царкоўных.

— Ці жывёле трэба даваць імёны?

— Думаю, што трэба. Карова і конь разумеюць, калі звяртаешся да іх па імені.

— А якія імёны найчасцей даюць ім людзі?

— Я маю карову клічу „Красуля”. Старую карову мы называлі „Бабкай”, але яе ўжо няма, мы яе прадалі.

— Як прыдумваеце імёны?

— Найлепш, калі коцік мае латкі, тады ён „Цяпак”, а чорны сабака будзе „Жучок” або „Кручок”.

— Ці святкуеце яго імяніны?

— Яшчэ ніколі ў жыцці я не святкавала імянін сабакі.

— А што Вы думаеце пра імёны звяроў для пашпартоў?

— У пашпартах найважнейшыя нумары. Імёны — справа другарадная.

— Ці Еўрасаюз будзе для Вас карысны?

— Для мяне будзе дрэнна, я не ведаю колькі гадоў буду жыць — ці пяць, ці дзесяць? Але вам, моладзі, можа калісьці штось і будзе!

Гутарылі Моніка Троц, Ева Багроўская і Юстына Хурса

Імя вызначае характар

Інтэрв’ю з айцом СЛАВАМІРАМ АЎКСЕЦЕЮКОМ, настаяцелем прыхода ў Дубічах-Царкоўных.

— Як цяпер людзі хрысцяць дзяцей?

— Па-рознаму. Часам ёсць такая сітуацыя, што маем два імёны. Адно імя, якім называюць дзіця ў хаце, напрыклад, Олаф, а ў царкве ён Аляксандр, можа быць таксама Моніка — Моіка, Каміль — Канстанцін. У царкоўнай практыцы ёсць так, што імя святога, якое даем дзіцяці, бярэм са спіска праваслаўных імён, або з царкоўнага календара.

— Ці ёсць праблемы з цяжкімі імёнамі?

— Ёсць архаічныя імёны, з першага, другога, трэцяга стагоддзяў, імёны сербскія або грэчаскія, не да канца зразумелыя нам. Таму рэдка іх ужываем, але яны ёсць, напрыклад, Аксенцій. Я бачу ў метрыкальнай кнізе такія запісы: Роберт, Бажэна, Івона, і я не ведаю ці гэтыя людзі так былі ахрышчаны, ці толькі запісаны. Інакш ёсць у дакументах, а інакш у царкве.

— Як пагадзіцца з двума імёнамі?

— Прапаную перадумаць гэтую справу. Кожнае імя прыдае іншы характар. Кожны святы меў індывідуальныя рысы, напрыклад, св. Лука быў лекарам, а св. Павел — вучоным. Цяпер грэчаскае імя Грыгорый абазначае „жывы”. Наданае дзіцяці імя раўняецца з прыданнем яму рысаў характару.

— Ці лёгка знайсці царкоўны адпаведнік?

— Калі прыходзяць бацькі, я ім даю адпаведнік, для Каміля дабіраем Канстанціна. Гэта можа быць імя, якое пачынаецца на такую самую літару, напрыклад, Бажэна — Барбара, Караліна — Кацярына. Але людзі вяртаюцца і да старых імёнаў, напрыклад, Наталля, Уладзімір, Анна, Аляксандр, да імёнаў нашых бацькоў і дзядоў.

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

— А калі бацькі хочуць захаваць імя ў царкве?

— У такіх выпадках падбіраем універсальнае імя, як Мацвей. Яно прынята і ў праваслаўных, і ў каталікоў. Хопіць, каб у нас было крыху добрай волі і цярплівасці.

— Ёсць імя Феўронія. Як справіцца з такім імем?

— Напэўна прыдумаем скарачэнне — Феўрця, як напрыклад Якуб — Кубусь. Імя ў дакументах будзе гучаць інакш, але гэта залежыць ад асяроддзя, дзе чалавек пражывае. Калісь быў такі час, калі людзі баяліся вымаўляць свае сапраўдныя імёны. Цяпер можна быць сабой і гэта трэба рабіць.

Моніка Троц, Адам Гуральчук

„Красавік” — школьная газетка ў Дубічах-Царкоўных

Беларускія загадкі

Сіняя пасцілка ўвесь свет закрыла.

Кругленькае, беленькае, усяму свету міленькае.

Бяжыць — скрыпіць, стане — маўчыць.

Сам у ботах, а хаджу на галаве.

Што без слёз плача?

Два браты адным поясам спавіты.

(Неба, сонца, вошы, цвік і вошах, скрыпка, кадкі ў пуоце)

Творчы свет Шымковічаў

У Музеі малой айчыны ў Студзіводах каля Бельска ўжо шосты раз наладзілася выстава мастацкіх твораў. Як заўважыў стваральнік музея Дарафей Фіёнік, вельмі ўдаюцца і карыстаюцца зацікаўленнем асабліва калектыўныя мерапрыемствы. На адкрыцці выставы дзве хаты (адна са старога двара дзядоў Дарафея Фіёніка і старшыні Рады гміны Пятра Кандрацюка, другая — са Стрыкоў) цесна набіты былі людам рознага ўзросту — студзіводцамі, вучнямі ліцэя і школьнай дзятвой, студэнтамі-іканапісцамі, спевакамі, сваякамі таленавітай сям'і Шымковічаў, народнымі творцамі, прадстаўнікамі ўлад. На выстаўцы сабрана была частка карцін сеніёра роду — 85-гадовага Яна Шымковіча (нар. у 1919 г.) са Стрыкоў з тэматыкай перш за ўсё рэлігійнай (ён аўтар між інш. іканастаса ў царкве ў Малешах і Галгофы ў Грыневічах-Вялікіх) і копіі карцін заходнееўрапейскіх мастакоў. Ян Шымковіч свой талент праявіў ужо ў пачатковай школе, прадказвалася яму мастацкая будучыня, на жаль, планы парвала вайна. Затое магла здабыць мастацкую адукацыю ягоная дачка Зінаіда (нар. у 1943 г.), якая вучылася ў Ліцэі мастацкіх тэхнік у Супраслі (закончыла яго ў 1964 г.), а пасля ў Кракаве стала архітэктарам. Ад дзесяці гадоў малюе яна аматарска (станковы жывапіс і пастэль), галоўным чынам партрэты сям'і і знаёмых, піша таксама партрэты са старых здымкаў, паказваючы герояў у часы іх маладосці, менш — пейзажы, кветкі, нацюрморты. На адкрыцці выстаўкі Зінаіда не прысутнічала — даўно прабывае за мяжой; аўтарку сустрэць можна будзе ў ліпені (выставу прац Шымковічаў можна будзе глядзець да канца канікул). Трэцяя гераіня выставы — унучка Яна, Альжбета Шымковіч-Себятынская (нар. у 1979 г.), выпускніца Студыума мастацкай фатаграфікі і экспазіцыі ў Варшаве, член Беластоцкай фатаграфічнай групы. Фатаграфуе яна ад 2001 года, займаецца таксама аналогавай фатаграфіяй і камп'ютэрнай графікай. Цікавіць яе найбольш рэпартажная фатаграфія: „На гэтай выставе хацела я запрэзентаваць пейзаж і святло Падляшша".

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Эля Шымковіч-Себятынская, Ян Шымковіч, а на партрэтах — малады Ян і Зінаіда Шымковіч

Уся сям'я Шымковічаў — мастакі ў душы. Бабуля Надзея ткала, Элін брат Крыштафор — адзін з заснавальнікаў рок-групы „Брага", а сам сеніёр роду Ян быў майстраваты на ўсе рукі — сам зрабіў і гітару, і мандаліну, і, вядома, іграў на іх. Ягоны сын Рыгор точыць у драўніне. Здаецца, само месца — Стрыкі (як, дарэчы, і не адна мясціна на нашым Падляшшы) спрыяе развіццю і росту талентаў. А адкуль яны бяруцца, каб запісаць красу нашага быту і ўпрыгожыць жыццё? Натуральна, як вясёлка над Студзіводамі, якая, падвойная, дугою скрапіла два канцы зямлі.

Міра Лукша

Вышыўка і карункі

На выстаўцы вышыўкі, карунак і вязання, арганізаванай Гайнаўскім домам культуры, якой адкрыццё адбылося 30 красавіка, паказаны экспанаты народных умельцаў Гайнаўшчыны. Некаторыя працы былі зроблены на вёсках некалькі дзесяткаў гадоў таму назад. Многія былі выкананы на працягу апошніх гадоў і ўпрыгожвалі прыватныя кватэры.

— Мяне бацька навучыў вязаць пруткамі, калі я яшчэ ў школу не хадзіла. Ён шыў кажухі і я навучылася гэтаму рамяству. Мае экспанаты роблены кручком старэйшыя, бо апошнім часам зрок ужо слабаваты і раблю толькі пруткамі, — заяўляе Вольга Грыц з Гайнаўкі. — Праекты для маіх работ выконваю самастойна. Бяру сшытак з клеткамі і рысую геаметрычныя ўзоры. Не люблю кветак і таму яны паяўляюцца ў маіх работах вельмі рэдка.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Вольга Грыц

Вольга Грыц ураджэнка вёскі Дольнае. У юнацтве памагала бацькам на гаспадарцы. Калі выйшла замуж, стала зарабляць на жыццё кравецтвам і вязаннем пруткамі. На выстаўцы многа яе вырабаў. Карункі спадарыні Вольгі выкарыстоўваліся ў якасці фіранак. Побач іх ляжаць дываны зробленыя з нітак. Майстрыха паясняе, што яны вельмі моцныя і могуць выкарыстоўвацца на бетонных падлогах. Людзі, што наведалі выстаўку, прыглядаліся на яе абрусы і пакрывалы на ложкі. Арганізатары мерапрыемства паінфармавалі, што многія вырабы можна будзе купіць.

Вольга Базылюк з вёскі Круглае прынесла вышываныя вырабы. Каляровыя абрусы выканала яна раней, а вышываныя карціны зрабіла нядаўна. У мінулым рабіла сурвэткі, а зараз, карыстаючыся крыжыкавай вышыўкай і матывамі з прыроды, робіць цікавыя мастацкія працы.

Міхал Клімук з Нікіфароўшчыны вельмі хутка вышывае крыжыкам. На папярэднюю выстаўку выканаў матыў з іконы „Тайная вячэра". Зараз на сваіх карцінах, апраўленых у рамкі, выкарыстаў прыродныя матывы. Найбольш вышываных краявідаў і матыў праваслаўнай капліцы падрыхтавала Анна Куптэль.

Сямейную калекцыю паказалі Валянціна Зялінко і яе дачка Галена. Яны вышываюць на падставе апрацаваных у журналах праектаў і таму здалёк іх карціны нялёгка адрозніць ад маляваных. Праваслаўныя матывы вышываюць Таіса Раманюк і Іаланта Галімская. Першая прадставіла карціну з краявідам Святой Гары Грабаркі, а другая вышыла матыў Іверскай іконы Божай Маці. Найбольш даўніх сурвэтак падрыхтавала Яніна Плева. На іх прыгожыя ўзоры звярталі ўвагу старэйшыя асобы, якія самі робяць яшчэ кручком.

(ам-з)

Сейце больш шэрсці

Праграмная рада „Нівы" выпусціла цікавую кніжку п.з. „Пакаленне вайны", якую складаюць успаміны насельніцтва Беласточчыны, запісаныя і літаратарамі, і журналістамі тыднёвіка, і намі — карэспандэнтамі. Кніга вартая пахвалы, хаця не ўсе запісаныя ўспаміны знайшлі ў ёй месца. Хачу ў гэтым месцы дадаць два факты якія мелі месца ў той час: адзін з перыяду савецкай акупацыі, другі — нямецкай.

Прафесар Мірановіч ва ўступе да кнігі напісаў пра саветаў: „Іх аграратэхнічныя веды і спосаб кіравання сталі пародыяй гаспадарання". І гэта святая праўда! У Дубічы-Царкоўныя прыехаў тады нейкі сельскагаспадарчы „інструктар" з усходу і склікаў сход, на якім пад неба выхваляў калгасы і савецкі спосаб кіравання сельскай гаспадаркай. Ён сказаў дубічанам м.інш.: „Сейте больше шерсти". Гэта была вялікая навіна, бо ў нас шэрсці яшчэ ніхто не сеяў, а ў саветаў яе, відаць, ужо сеялі. Пачуўшы гэта, наш скоры да смеху аднавясковец, якога звалі Леўчыкам, пачаў рагатаць з гэтай сенсацыі. Тады інструктар прабубніў праз зубы: „Я тебе нахохочу, что увидишь белых медведей". Чалавек злякаўся, а мясцовыя камуністы маўчалі, быццам вады ў рот набраўшы; відаць, сорамна ім было, што „вучоны" чалавек з усходу скампраметаваўся ў вачах невучоных нашых людзей.

Пра немцаў Яўген Мірановіч піша, што яны „нічым не прыпаміналі тых, якіх людзі памяталі з восені 1939 года". Гэта таксама святая праўда, бо колькі мы былі варты ў вачах немцаў сведчыць наступны факт. У пачатку 1943 года ў дубіцкую школу быў скліканы сход, на які брычкай прыехаў нямецкі інструктар з ручным кулямётам. Ён па-польску-сілезску стаў гаварыць пра нямецкі парадак: „Вы нам, як людзі, непатрэбныя, толькі патрэбная тая зямля, на якой вы пражываеце. Нам хопіць толькі дзесяць gospodynów талковых, а рэшту вас — за стадолу і bęc". Наканец зароў ён: „Каб праз тры секунды па вас і следу не асталося!" ды выстраліў з кулямёта ўгару. Не апісаць, што тады рабілася; дубічане, якія стаялі ззаду, хутка шмыганулі ў дзверы, а тафіляне, якія сядзелі спераду, дык клубіліся ў дзверы адзін праз аднаго.

Такі смак кожнай акупацыі і кніга „Пакаленне вайны" выдатна пра гэта сведчыць.

Мікалай Панфілюк

Русіфікацыя Беларусі трагічная ў тым, што заглушае яна ўзніклую нацыянальную культуру, каланізуе, музеяфікуючы яе да ўзроўню археалагічнасці...

Беларуская нацыя Еўропы

У выніку Другой сусветнай вайны, беластоцкі ўзмежак этнічнай Беларусі апынуўся ў складзе пасляваеннай Польскай Рэчы Паспалітай. Прыблізная колькасць беларускай мяншыні ў гэтым рэгіёне склала каля 150 тысяч чалавек. З-за нацыянальнай няспеласці беларусаў наогул, іх лік у Беластоцкім краі немагчыма аб'ектыўна ўстанавіць. Нядаўні перапіс насельніцтва Польшчы паказаў, што беларусаў налічваецца блізу 50 тысяч, амаль выключна на Беласточчыне. Паводле веравызнаўчай арыентацыі — беларусамі лічаць сябе праваслаўныя, якія ў сваёй большасці самавызначыліся людзьмі аднак польскай нацыянальнасці; прыкладна дзве траціны, двух з траіх. На поўнач ад ракі Супрасль і да Аўгустоўскага канала дамінуюць рыма-католікі, месцамі цалкам, і там беларуская этнічнасць не мае значэння. Касцёл у нас бездыскусійна польскі, моцна патрыятычны, нярэдка нацыяналістычны.

У параўнанні са спомненай колькасцю свядомых беларусаў, праваслаўных на Беласточчыне ўтрая больш, а беларускамоўнага насельніцтва разам будзе да 200 тысяч жыхароў. Сярод рыма-католікаў толькі інцыдэнтальна сустракаюцца беларускія дэкляранты (некаторыя інтэлігенты).

Ва ўмовах імперскай дамінацыі СССР, польскія ўлады арганізавалі сетку вясковых і местачковых сярэдніх школ з беларускай моваю навучання. Забяспечана было выданне беларускамоўных падручнікаў, якія падрыхтавалі мясцовыя педагогі. Накіравана ў мінскія вышэйшыя школы значную групу студэнцкай моладзі з намерам узмацніць кадру беларускамоўных настаўнікаў; дзейныя з іх прымалі ўдзел у штолетніх курсах, якія праводзіла Міністэрства асветы БССР. Узнікла беларуская філалогія ў Варшаўскім універсітэце і ў Завочным настаўніцкім інстытуце ў Беластоку.

Чыста беларускамоўныя школы пратрымаліся, аднак жа, нядоўга. На зломе пяцідзесятых і шасцідзесятых гадоў іх ужо не было, пераўтварыўшыся ў польскамоўныя з дадатковым прадметам беларускай мовы. Адбылося гэта зусім не пад ціскам адміністрацыі, але выключна па волі бацькоў. Даходзіла нават да скандальных скаргаў тых жа бацькоў на чыноўнікаў, якія супрацівіліся ліквідацыі беларускага школьніцтва.

Варшава паспрыяла ўтварэнню масавага Беларускага грамадска-культурнага таварыства і рэдакцыі беларускага тыднёвіка „Ніва", а неўзабаве і беларускіх радыёпраграмаў у беластоцкай радыёстанцыі. Пачалі выходзіць беларускія кніжкі, літаратурныя тутэйшых аўтараў, і навуковыя польскіх вучоных-беларусаў.

Адносіны польскіх улад да сваіх беларусаў залежалі ад становішча беларускай культуры і мовы ў самой Беларусі. Адначасна з узмацненнем русіфікацыі БССР выявіліся паланізацыйныя тэндэнцыі ў трактоўцы беларускага культурнага жыцця на Беласточчыне. Савецкія таварышы польскіх камуністаў давалі зразумець, што існаванне беларускага энклава ў памежным Беластоцкім ваяводстве дрэнна ўплывае на... камуністычнае будаўніцтва ў БССР, асабліва ў заходніх акругах рэспублікі.

У дэкаду сямідзесятых гадоў мела месца інтэнсіўнае згортванне польскай беларушчыны; год у год скарачаліся датацыі, навучанне беларускай мовы пераведзена на добраахвотную аснову, забаронена выкладанне элементаў гісторыі Беларусі. Штучна рэдукавана актыўнасць творчых асяроддзяў, мастацкай самадзейнасці. Згодна савецкім узорам, беларускасць кляймілася як агідны нацыяналізм. Дасканала сацыялістычным лічылася ўсенька польскае, як усенька расійскае ў СССР.

Поўную нацыянальную катастрофу прадухіліла нам рэвалюцыя „Салідарнасці" ў пачатку васьмідзесятых гадоў, пасля ўпадак камунізму, які ў нашым баку славяншчыны набыў яскрава шавіністычную афарбоўку, часамі ажно расісцкую. Імперыя падала пад уласным цяжарам, валячыся ад мілітарызму галоты.

У клімаце маральнага выбуху „Салідарнасці" выйшла на гістарычную арэну беларускае студэнцтва Польшчы. За лічаныя гады ўзнікла структура нацыі, уключна з палітычным рухам, які ў шматлікіх самаўрадавых органах мае цяпер значныя ўплывы. Актуальна звяз беларускіх арганізацый блізіцца да ліку дзесяці суб'ектаў. Апошняя дэкада XX стагоддзя характарызавалася нечуванай раней ажыўленасцю польскіх беларусаў.



Палякі цягнуць за сабою ў Еўропу сваіх беларусаў. Беластоцкі край у Еўрасаюзе будзе маленькім энклавам, аскепкам беларускай этнічнай тэрыторыі.

Што гэта значыць?

Перш за ўсё адкол ад мацярынскай Рэспублікі Беларусь. Яна нам ужо чужая па прычыне татальнай русіфікацыі. Наша ўражанне такое, што ў Рэспубліцы няма нацыі, а толькі савецкае насельніцтва, духоўна безаблічнае. Гэта не нацыянальная дзяржава, а сацыяльная; дзяржава не сэрцаў, а жыватоў.

Разам з адыходам з жыцця пакаленняў, што памяталі Беларусь, маючы з ёю сваяцкія сувязі, маладыя па абодвух баках кардону ўжо не адчуваюць этнічнае лучнасці. Гаснуць не толькі родавыя эмоцыі. Маладабеларусы павернуты на Захад; ім Расія незразумелая, не з нашага свету. Гэтак жа прыпадобненая на яе Беларусь, фактычна другая дзяржава рускіх. Рускі лёс у нашым старонні адназначна негатыўны, папраўдзе сінонім беднасці, няшчаснасці. Словам: няма чым захапляцца на ўсход ад Буга.

На беластоцкую адчужанасць уплываюць і самі савецкія беларусы, якім мы — палякі! Аніяк не растлумачыць ім, што мы таксама беларусы. Кволая нацыянальная свядомасць не дазваляе быць нацыянальна салідарнымі; глядзяць яны на нас не болей, як на людзей, якім гістарычна пашэнціла лепей жыць. На польскім Захадзе, а пасляўтра ўжо ў Еўрасаюзе.

Нацыю стварае менавіта асобны лёс, на глебе якога вырастае і культурная асобнасць, хоць не заўсёды моўная адрознасць. Прыкладам кажучы, у Швейцарыі чатыры афіцыйныя мовы, але нацыя адна; у сербаў і харватаў — адна на дваіх мова; аўстрыйцы — гэта немцы з асобнай дзяржаваю. Вось тры варыянты нацыяствaральнасці. Русіфікацыя Беларусі трагічная ў тым, што заглушае яна ўзніклую нацыянальную культуру, каланізуе, музеяфікуючы яе да ўзроўню археалагічнасці. Месца беларускай заняла руская, прычым перыферыйная, так сказаць: беларуска-руская (па аналогіі англійскіх моваў у англафонскіх дзяржавах?).

Польскі лёс беластоцкага энклава беларусаў робіць іх іншымі ад савецкіх (постсавецкіх) беларусаў. Беластачане накіраваны ў бок сусветнай дынамікі; Рэспубліка Беларусь туляецца ў цяні Расіі, удзельная вага якой у глабальнай эканоміцы не перавышае ўсяго двух працэнтаў. Яна, фактычна, паўкалонія Еўропы, яе сыравінны дадатак.

Надзвычай істотным параметрам беларускай нацыянальнай меншасці Польшчы з'яўляецца ейная тэрытарыяльнасць; мы не дыяспара, але беларускамоўны рэгіён польскае дзяржавы. У нас свой краявід, сваё поле і лес, свае мястэчкі і вёскі, свой хлеб. Словам: свая Малая Бацькаўшчына. Са сваім небам і зімамі. Першапачатковай праявай фармавання нацыянальнасці лічыцца культурная спецыфіка і яе ажыўленасць. У Польшчы нарадзілася другая беларуская літаратура, іншая ад савецкай. Гэтая польска-беларуская літаратура дасягнула ўжо жанравай ды арганізацыйнай камплектнасці, мае сваё месца ў еўрапейскім літаратурным жыцці. Выходзяць уласныя перыядычныя выданні, у іх ліку і на мовах Еўропы. Шэраг аўтараў карыстаецца вядомасцю не адно ў Польшчы, але і на Захадзе — у Нямеччыне, Англіі, Італіі.

Рэалізавалася беларускамоўная нацыя Еўропы, новы народ. У гэтай жа ўсходняй памежнай паласе Еўрасаюза будуць знаходзіцца беларускамоўныя Віленшчына і Латгалія. Смуга беларушчыны працягнецца ад ваколля Рыгі да пабужнага Брэста.

Сакрат Яновіч

Тэкст выступу перад студэнтамі Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта 28 красавіка 2004 года.

Аблічча збройнага падполля

Стараюся пашыраць свае веды пра збройнае падполле. Параўноўваю ўспаміны падпольных змагароў і пішучых пра той час аўтараў са сваімі ўспамінамі. Мяркую, што празмерна абагаўляецца збройнае падполле і яго дзейнасць, стараючыся падчас скрыць злачынствы, некаторых яго членаў.

У падполлі апынулася шмат людзей, якім праца на зямлі не адпавядала; ужо гэта выразна раскрывае тых людзей. Каб ухіліцца ад кары за злачынствы некаторыя з іх уцяклі на Вернутыя землі, аднак, і там, не прывыклыя да працы, арганізавалі яны напады, напрыклад, на ваенную часць у Ожышы 18 снежня 1946 года.

Некаторыя члены падполля маюць на сумленні кроў невіноўных людзей: дзяцей, моладзі і старэчаў, якіх лічылі канфідэнтамі. Загінулі жыхары Залешан, Заняў і Краснага Сяла, якія не былі канфідэнтамі. 20 мая 1945 года ў Патоцы каля Тапалян спалена жывымі трое дзяцей ва ўзросце 10, 16 і 18 гадоў...

Ставіцца закід уладам новай пасляваеннай Польшчы і НКУС у тэроры. Той тэрор адчулі толькі падпольшчыкі, бо мірныя людзі былі намнога больш тэрарызаваныя падполлем. Такім чынам збройнае падполле падштурхнула многіх уступаць у дзяржаўныя органы, каб бараніць насельніцтва і яго маёмасць. Ці дзяржава, якая атрымала міжнароднае прызнанне, пазбаўлена права скараць нелегальныя збройныя структуры, якія змагаюцца за звяржэнне дзяржаўнага парадку?..

Шматлікія падпольныя камандзіры ніжэйшага рангу вырашалі пра жыццё і смерць людзей на аснове даносаў ці паводле ўласнага меркавання, напрыклад, за перастрэлку паміж падпольшчыкамі 16 мая 1945 года каля маёнтка Геранімова яны расстралялі чатырох жыхароў Патокі, а вёску спалілі, тлумачачы, што гэта адплата за грабеж перасяленцаў у маёнтку Геранімова. Солтысу вёскі Яну Бекішу загадалі аддаць зброю; ён адказаў, што не мае...

— А што будзе, калі знойдзем? — спыталі баевікі V Віленскай брыгады „Зыгмунта".

— Тады мяне расстраляеце, — адказаў солтыс.

Пісталет знайшлі ў адзенні солтысавага сына Уладзіміра і тым пісталетам расстралялі сына ў хаце, а бацьку на панадворку. Расстралялі таксама Уладзіміра Малашэўскага, члена ППР, і ягонага сына.

Некаторыя аўтары, якія пішуць пра дзейнасць падполля, абапіраюцца толькі на дакументы таго ж падполля, не клапоцячыся праверкай іх на аснове іншых дакументальных крыніц. Даволі частай з'явай у славячых падполле матэрыялах з'яўляецца блытанне геаграфічных назваў.

У падпольных атрадах апынуліся і сумленныя людзі, якія адмаўляліся ад расстрэлу невіноўных, ад злачынстваў і бандытызму. Яны хацелі жыць так як і ўсе. Такі шанс дала ім амністыя ад 22 лютага 1947 года; скарысталі з яе 8 647 асоб. Амністыя дала надзею на стабілізацыю. Ліквідацыя рэштак атрадаў, у якіх асталіся тыя, якіх натура цягнула ў лес, аставалася ўжо толькі пытаннем часу.

Канстанцін Масальскі

Гісторыка-нумізматычны сайт з даволі цікавай прэтэнзіяй на назву беларускай валюты...

talar.miensk.com

Як вядома, грошы любяць, каб іх лічылі. Добра калі гэтыя грошы свае. Пільны пералік іх заўсёды быў справай важнай і патрэбнай. У той жа час лічэнне чужых грошай адносіцца да правілаў дурнога тону. Таму сёння прапаную палічыць тыя фінансавыя скарбы, якія з поўнай упэўненасцю можна назваць сваімі, беларускімі. Для гэтага трэба ўсяго толькі зазірнуць на сайт у Інтэрнэце пад адрасам: talar.miensk.com.

Калі вандроўнік па сеціве набярэ гэты адрас, на яго маніторы хутка раскрыецца выяўленне старадаўняй манеты, што без перапынку круціцца на шэрым фоне экрана побач са здымкам краявіду, на якім напісана „Таляр беларускі".

Па ўсім відаць, што гэта гісторыка-нумізматычны сайт з даволі цікавай прэтэнзіяй на назву беларускай валюты, якая яшчэ год-два таму, здавалася, увогуле перастане існаваць. Але сёння такая небяспека, можа часова, але мінула і таму, хіба, варта пафантазіраваць разам з распрацоўшчыкам сайта аб тым, якая назва больш за ўсё падыходзіць для беларускіх грошай. Зрабіць гэта няцяжка, бо на галоўнай старонцы падаюцца варыянты адказаў, за адзін з якіх вы можаце прагаласаваць. Як сведчаць вынікі галасавання на даны момант, большасць з 26-ці прагаласаваўшых лічаць, што найлепшая назва — таляр, які складаецца са 100 грошаў.

Калі ж вандраваць далей, перад вамі адкрыецца так званая „Гасцёўня талярава", праз якую можна выйсці да цікавых артыкулаў па розных тэмах беларускай нумізматыкі. Анонсы гэтых тэм разам з выяўленнем адпаведных манет знаходзяцца з левага боку старонкі. Варта прыглядзецца да іх больш уважліва.

„Каталёг сучасных манэтаў" першая і, здаецца, найбольш цікавая рубрыка ва ўсім сайце. У ім змешчаны, калі не ўсе, то амаль усе выяўленні манеты, якія былі выпушчаны беларускім Нацыянальным банкам за гады незалежнасці. Не толькі спецыялісту-нумізмату, але і звычайнаму чалавеку пэўна будзе карысна, хоць бы для ўласнай эрудыцыі, пазнаёміцца з металічнымі беларускімі грошамі, тым больш, што ў паўсядзённым жыцці з імі не сустрэнешся. А гэта таму, што ўсе яны былі выпушчаны збольшага, як сувеніры і вартасныя рэчы, а не плацежныя сродкі. Тым не менш, не дрэнна даведацца, як увогуле маглі б выглядаць беларускія рублі ў метале. Ну а тэматыка прадстаўленых узораў самая разнастайная — манеты рознай вартасці адбітыя да юбілеяў вядомых людзей, да значных гістарычных дат у жыцці Беларусі і свету, прысвечаныя спартыўным спаборніцтвам і гарадам краіны.

Далей ідзе рубрыка-артыкул „Кароткі агляд манэтаў Рэчы Паспалітай". Адразу заўважу, што тычыцца гэта таго перыяду гісторыі, калі ўся Беларусь уваходзіла ў Вялікае княства Літоўскае і „дзяржаву абодвух народаў". Здымкі манет, здаецца, перадаюць атмасферу даўно адышоўшай эпохі.

Вартым увагі падаецца рубрыка „Чужыя манэты пра нашых людзей", дзе апісваюцца і паказваюцца выяўленні выпушчаных па-за межамі Беларусі каштоўных манет з выявамі Янкі Купалы, Якуба Коласа (Расія), Жыгімонта Аўгуста (Польшча).

Ніжэй у „Гасцёўні" ідуць артыкулы з разважаннямі аб больш адпавядаючай назве беларускіх грошай, гісторыі паходжання слова „таляр". У правым баку старонкі знаходзіцца так званы „Таляраў летапіс". У ім стваральнік сайта Дзмітрый Гулецкі размясціў найважнейшыя на яго думку падзеі, што тычацца беларускай нумізматыкі, яе асвятленню ў Інтэрнэце.

Уладзімір Лапцэвіч

Першы медаль для Рэчы Паспалітай на алімпійскіх гульнях здабыў у 1924 г. коннік з Гродна Адам Крулікевіч...

Беларусь, беларусы...

Пад сцягам Рэчы Паспалітай

Польшча як дзяржава дэбютавала на алімпійскіх гульнях у Парыжы ў 1924 годзе. І першы медаль для Рэчы Паспалітай здабыў коннік з Гродна Адам Крулікевіч. У сталіцы Францыі ён стаў трэцім у турніры па пераадоленню перашкод на кані. Многа пазней спартоўцы з горада над Нёманам заваююць мноства медалёў для СССР і незалежнай Беларусі. Ніхто не праводзіў дакладных падлікаў, але сярод гарадоў свету з насельніцтвам да 300 тысяч жыхароў Гродна напэўна будзе ў дзесятцы па колькасці алімпійскіх прызёраў.

Яшчэ адзін прадстаўнік Гродзеншчыны выступаў за Польшчу на апошняй алімпіядзе да другой сусветнай вайны — у Берлін у 1936 годзе прыехаў стралок Міхал Вярсоцкі. Ён вырас і сфармаваўся ў славутых Гальшанах, куды сям'я пераехала з Валожыншчыны ў пачатку 1920-х. У сталіцы нацысцкай на той час Нямеччыны 23-гадовы Вярсоцкі не здабыў лаўраў, заняўшы толькі 24-е месца. Але свой след у гісторыі гальшанец пакінуў. Пасля вайны Міхал стаў ветэрынарам, дапамагаў землякам-вяскоўцам. Памёр у 1979 годзе і пахаваны на гальшанскіх могілках. Цікава, што з роду Вярсоцкіх паходзіў беларускі рымска-каталіцкі святар і грамадскі дзеяч Янка Вярсоцкі, які быў вывезены ў Казахстан і расстраляны ў 1937 годзе ў засценках НКВД.

Ураджэнец Гродна Вітольд Герута браў удзел у першай пасляваеннай алімпіядзе 1948 года. 36-гадовы лёгкаатлет выступаў у дзесяцібор'і. Пазней Герута стаў трэнерам нацыянальнай польскай дружыны па лёгкай атлетыцы. Яшчэ аднаго спартоўца Польшчы даў Ваўкавыск. Юры Кавалеўскі нарадзіўся ў 1944 годзе. Пасля вайны сям'я пераехала за мяжу, з дзяцінства Юры захапіўся скачкамі ў ваду. 16-гадовы юнак у 1960 годзе выступаў на рымскай алімпіядзе, дзе заняў 15-е месца па скачках з трампліна.

Знакамітая польская валейбалістка Ядвіга Марко-Ксянжкова нарадзілася ў заходнебеларускай Зэльве. Доўгія гады яна выступала за польскую дружыну. На алімпіядзе 1964 года ў Токіо Марко-Ксянжкова ў складзе каманды стала бронзавай медалісткай.

Напрыканцы алімпійскіх гістарычных нарысаў хочацца згадаць яшчэ двух беларускіх спартоўцаў, якія ўпісалі свае прозвішчы ў гісторыю алімпійскіх гульняў. Іх медалі ў залік Беларусі не ідуць таму, што на момант выступаў за СССР у Беларусі яны не жылі. У Шчучыне вырас кідальнік молата Васіль Хмялеўскі. На мюнхенскіх гульнях 1972 года ён прадстаўляў горад Стаўрапаль і выйграў бронзавы медаль. Срэбра ў складзе зборнай СССР па валейболе на сеульскай алімпіядзе 1988 года заваяваў Юры Сапега, ураджэнец Гродна. Бліскучы майстар, носьбіт славутага прозвішча быў двухразовым чэмпіёнам Еўропы, уладальнікам Кубка свету, срэбным і бронзавым прызёрам чэмпіянатаў свету, пяціразовым пераможцам Кубка еўрапейскіх чэмпіёнаў. Старэйшы брат Юрыя, Аляксандр, быў не менш вядомым валейбалістам. У 1990 годзе Аляксандр Сапега трагічна загінуў на тэрыторыі Смаленскай вобласці — яго забілі невядомыя бандыты. Малодшы брат Юры пасля доўгіх выступаў за маскоўскі ЦСКА завяршаў сваю кар'еру ў Італіі. На Апенінах Сапега стаў трэнерам, пазней атрымаў запрашэнне стаць галоўным трэнерам расійскай дружыны, якая перажывала заняпад і вывеў яе на сіднейскай алімпіядзе 2000 года на другое месца. Цяпер Юрый Сапега жыве пераважна ў Італіі, але штогод прыязджае ў горад над Нёманам да маці і на турнір па валейболе сярод юнакоў у памяць брата.

Падрыхтаваў Уладзімір Хільмановіч

Беларусы ў Любліне

У канцы красавіка мела я нагоду наведаць з экскурсіяй студэнтаў майго універсітэта (KUL) Казімір-Дольны-на-Вісле. У час гэтай экскурсіі я пазнаёмілася не толькі з помнікамі гэтага цудоўнага горада, але і са студэнтамі з Беларусі. Экскурсія завяршылася вогнішчам, мы з сяброўкай селі на лапіку нейкай пластмасавай сумачкі і пачалі сілкавацца. І вось тады я нечакана пачула мелодыю песні „Тры чарапахі" гутру Н.Р.М.; даходзіла яна — як пазней высветлілася — ад дзвюх студэнтак і студэнта з Беларусі, якія паміж сабою гутарылі на беларуска-польска-рускай трасянцы. Я адазвалася да іх па-беларуску і яны вельмі здзівіліся:

— Ты, у Польшчы, — сказаў хлопец, — размаўляеш па-беларуску лепш чым мы. Клас!

Адной з дзяўчын, дзевятнаццацігодцы Людзе — студэнтцы першага курса тэалогіі — размова па-беларуску давалася цяжка; яна часта ўключала польскія і рускія словы. Калі я папрасіла, каб яна гаварыла па-польску, яна, крыху падумаўшы, адказала:

— Не. Трэба гаварыць па-свойму, а то я ўжо забываю.

Гэтая, вось, Люда запрасіла мяне на імшу, якая адпраўлялася наступнага дня ў сядзібе Фонду Яна Паўла II па вуліцы Бочнай-Любамерскай. Па дарозе на набажэнства Люда расказала мне, што фонд дапамагае стыпендыямі студэнтам і з Украіны, Расіі, Казахстана, Літвы ды Латвіі, а таксама ладзіць іншыя мерапрыемствы. Ужо на месцы Люда пазнаёміла мяне з іншымі беларусамі, якія прыйшлі на імшу.

Група беларускіх студэнтаў святкуе дзень нараджэння Люды (чацвёртая справа))

Мне ўдалося яшчэ пагутарыць з дыяканам Андрэем Жылевічам, які прымаў удзел у імшы і спатканні ў фондзе.

— ***У чым заключаецца дзейнасць Фонду Яна Паўла II?***

— Мае дачыненні з фондам сціплыя. Такія сустрэчы ладзім беларусам раз у месяц, каб памаліцца, сустрэцца.

— ***Колькі асоб налічвае мясцовая група беларусаў?***

— Мяркую, што каля сотні, але не ўсе студэнты ведаюць і прыходзяць на нашы сустрэчы.

— ***Што, паводле вас, даюць такія сустрэчы? Ці маладыя людзі ў сваім жыцці беражней адносяцца да беларускай мовы?***

— Скажу ад сябе: Польшча навучыла мяне сапраўднага патрыятызму і калі я прыязджаю дахаты, размаўляю па-беларуску. Я думаю, што гэтая плынь будзе буйнець.

— ***А ці моладзь дацэньвае мову?***

— Па-мойму — не да канца. Большасць беларускай моладзі дрэнна валодае беларускай мовай, рэдка яе ўжывае. Многія прыехалі сюды з гарадоў, са школ, у якіх заняткі вяліся на рускай мове.

— ***А як гэтая праблема выглядае ў Беларусі?***

— Як мне здаецца, большасць насельніцтва Беларусі карыстаецца рускай мовай, галоўным чынам у гарадах. У вёсках размаўляюць на г.зв. „трасцянцы". Мяркую, што беларуская мова мае будучыню, бо сучасная інтэлігенцыя яе патрабуе.

— ***Беларускія студэнты былі вельмі здзіўлены, калі даведаліся ад мяне, што ў дзвюх сярэдніх школах у Польшчы навучаецца беларуская мова. А ці вы пра гэта ведалі?***

— Так: калісь я ехаў на аўтобусе, якім падарожнічалі дзяўчаты з Беласточчыны; тады я пра гэта і даведаўся.

— ***Дзякую за размову.***

Жанэта Роля

XXIII Міжнародны фестываль царкоўнай музыкі Гайнаўка 2004

ПРАГРАМА ФЕСТЫВАЛЮ

Інаўгурацыя фестывалю

25 мая 2004 г. (аўторак), гадз. 18.00, Беластоцкая філармонія

Адкрыццё Фестывалю

Інаўгурацыйны канцэрт у выкананні лаўрэата XIII МФЦМ Гайнаўка 1994 — Камернага хору „Благавест" і Аркестра „Sinfonia Contertante" Латышскай музычнай акадэміі ў Рызе пад кірункам Аляксандра Брандаўса.

Аўтарскі канцэрт

26 мая 2004 г. (серада), гадз. 18.00, Беластоцкая філармонія

Аўтарскі канцэрт сусветнай славы англійскага кампазітара — **Сір Джона Тэвенера** — ганаровага госця Фестывалю.

Канцэрт у выкананні лаўрэата XXII МФЦМ Гайнаўка 2003 Камернага хору Маскоўскай кансерваторыі імя Пятра Чайкоўскага пад кірункам праф. Барыса Тэўліна.



Джон Тэвенер

Конкурсныя слуханні

27 мая 2004 г. (чацвер), гадз. 17.00, Беластоцкая філармонія

Калектыў „Con Sono" са Слубіц
Калектыў „Малітва" з Росдал (Бельгія)
Камерны хор „Крэда" з Калінінграда (Расія)
Хор Політэхнічнага інстытута з Беластока
Ансамбль старажытнацаркоўнага песнапення „Сретение" з Харкава (Украіна)
Камерны хор „Алілуя" з Софіі (Балгарыя)
Камерны хор горада Калуга (Расія)

28 мая 2004 г. (пятніца), гадз. 17.00, Актавы зал б. Палаца Браніцкіх

Узорны дзіцячы хор „Cantare" з Оршы (Беларусь)
Мешаны хор „Stiv Naumov" з Бітолы (Македонія)
Мешаны камерны хор „Св. Іаан Прадцеча" з Казанлыка (Балгарыя)
Хор Аддзялення праваслаўнай тэалогіі Універсітэта ў Прэшаве (Славакія)
Мужчынскі камерны хор з Таліна (Эстонія)
Мешаны камерны хор з Харкава (Украіна)
Хор Школы царкоўнага песнапення з Масквы (Расія)

29 мая 2004 г. (субота), гадз. 16.00, Беластоцкая філармонія

Хор Політэхнічнага інстытута з Гданьска
Хор „Псалмодыя" Папскай тэалагічнай акадэміі з Кракава
Хор Праваслаўнага брацтва імя Архістраціга Міхаіла з Мінска (Беларусь)
Камерны хор „Легенда" з Дарагабыча (Украіна)
Мешаны хор „Aukuras" Музычнага цэнтра з Клайпеды (Літва)
Мешаны хор Акадэміі музыкі, тэатра і мастацтва з Кішынёва (Малдавія)
Капэла Дзяржаўнага універсітэта з Томска (Расія)

Заканчэнне Фестывалю

30 мая 2004 г. (нядзеля), Беластоцкая філармонія

гадз. 15.30 — аб'яўленне рашэння журы і ўручэнне ўзнагарод
гадз. 17.00 — Гала-канцэрт

ДЖОН ТЭВЕНЕР (1944 год нар.) дэбютаваў у 1968 г. драматычнай кантатай „The Whale" (Кіт), якая штурмам заваявала прыхільнасць публікі ды прыцягнула ўвагу тагачаснай зоркі поп-культуры — гурту Бітлз, які і запісаў музыку Дж. Тэвенера пад шыльдай сваёй студыі „Apple". Зацікаўленасць Дж. Тэвенера Праваслаўнай царквою прывяла з аднаго боку да пераходу кампазітара ў праваслаўе ў 1977 г., а з другога — істотна перамяніла ягоны кампазітарскі стыль. Паводле Тэвенера, усходняя традыцыя зберагла „першабытную сутнасць", якую свет Захаду згубіў. Незадаволены з'явай у заходняй класічнай музыцы, якую акрэсліў як „перанасычанасць інтэлектуалізмам", кампазітар сузірае старажытную традыцыю ды намагаецца ствараць іконы ў сферы гуку.

Некаторыя самыя вядомыя кампазіцыі гэтага „праваслаўнага перыяду" творчасці: „Orthodox Vigil Service" (Усяночнае чуванне), „Akathist of Thanksgiving" (Акафіст), „The Protecting Veil" (Вуаль), „Resurrection" (Уваскрэсенне), „Mary of Egypt" (Марыя з Егіпта).

У 2000 годзе Дж. Тэвенер за „заслугі для Музыкі" атрымаў ад брытанскай каралевы шляхецтва.

(ам)

Віншуем спадара ЯЎГЕНА САЧКО з гарловым выбарам на дырэктара II Агульнаадукацыйнага ліцэя з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы. Жадаем поспехаў на асветнай і грамадскай ніве.

Беларускі саюз у РП, Беларускі форум самакіравання, рэдакцыя

Вялікае беспрацоўе ў нашым рэгіёне давяло да сітуацыі, што амаль кожны з нас мае сярод сваіх сямейнікаў ці знаёмых асоб, якія шукаюць працу. Каб неяк памагчы такім людзям, вядзем рубрыку „Дапамагаем з «Нівай»". Побач бясплатна будзем змяшчаць аб'явы людзей, якія шукаюць працу або могуць даць працу. Сардэчна запрашаем усіх чытачоў дасылаць у рэдакцыю свае прапановы. Рубрыку вядзе Паўліна Шафран-Асташэвіч, з якой можна кантактавацца па мабільніку нумар 0600 635 425 (або ў рэдакцыі па панядзелках ад 10 да 12 — тэл. 743 50 22).

ШУКАЮ ПРАЦУ

• Мужчына шукае працу ў Беластоку, сярэдняя адукацыя, уласная машына, стаж працы механікам легкавых аўтамабіляў, тэл. 653 31 62.

• Шукаю працу ў пякарні (Беласток), вопыт, санітарны мінімум, кніжка здароўя, правы кат. В, тэл. 661 89 08.

• Малады мужчына, 28 гадоў, тэхнічная адукацыя, уласная грузавая машына, шукае працу ў Падляшскім ваяводстве, тэл. 0608 151 373.

• Бармен, санітарны мінімум, кніжка здароўя, праца толькі ў Беластоку (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0602 318 086.

• Малады электрамеханік, сярэдняя адукацыя, кніжка здароўя, тэл. 0692 438 475.

• Студэнт-завочнік ахвотна паможа ў цяжэйшых працах на гаспадарцы, правы кат. В, мноства вольнага часу, тэл. 0505 057 491.

• Малады мужчына, абслуга камп'ютэра, санітарны мінімум, сярэдняя адукацыя, правы кат. В, уласная машына, тэл. 0508 638 195.

• Студэнт шукае працу ў Беластоку, правы кат. В, уласная машына, абслуга камп'ютэра, аператыўны, тры месяцы працы ў аптовым складзе агародніны (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0604 431 766.

• Адказны мужчына, 26 гадоў, сярэдняя тэхнічная адукацыя, вопыт у будаўнічых працах, рамонтах, пільна шукае працу ў Беластоку (сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0504 868 384.

• Мужчына, 34 гады, электрык, тэхнічная адукацыя, правы кат. АВС, шукае працу ў Беластоку, тэл. 0604 322 683.

• Жанчына, 49 гадоў, спакойная, без дрэнных схільнасцей, заапякуецца дзіцём або старэйшай асобай, тэл. 661 15 92.

• Студэнтка шукае працу ў Беластоку, правы кат. В, добрае веданне англійскай і рускай моў, абслуга камп'ютэра (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць) тэл. 0602 769 109.

• Бухгалтар, 37 гадоў, з вопытам шукае працу ў Беластоку, правы кат. В, уласная машына, спакойны, без дрэнных схільнасцей, тэл. 0695 736 234.

• Малады мужчына шукае працу ў ваколіцах Бельска-Падляшскага, правы кат. В, сярэдняя адукацыя, абслуга камп'ютэра, тэл. 0501 081 637.

Дапамагаем сабе ўзаемна

У Бельску: 730 20 06

• Сям'я патрабуе мэблі, пасцелі і адзення для дзяцей у школьным узросце.

• Самотная маці з хворым сынам ва ўзросце 12 гадоў будзе ўдзячна за ўсякую помач пры закупе лякарстваў, галоўная патрэба — інвалідная каляска.

• Сям'я просіць дапамогі: патрэбная мэбля, лёгкае адзенне для хлопцаў ва ўзросце 6, 8, 13 гадоў.

• Сям'я патрабуе дапамогі ў лячэнні хворай 13-гадовай дзяўчынкі.

• Сям'я, якая выхоўвае трое дзяцей, патрабуе штаноў і куртак для хлопцаў ва ўзросце 10 і 13 гадоў, ботаў і адзення для 5-гадовай дзяўчынкі.

• Самотная маці з дума сынамі ва ўзросце 10 і 13 гадоў, якая пасля смерці мужа апынулася ў трагічным становішчы, прыме любую дапамогу дзеля стварэння нармальных умоў існавання, прыдасца старая мэбля, халадзільнік, тэлевізар.

У Беластоку: 732 01 86, 712 11 53

• Адзінокая маці, якая выхоўвае чацвёра дзяцей, патрабуе адзення для 7-, 9- і 12-гадовых хлопцаў і для 15-гадовай дачкі, пледаў і пасцелі.

• Сям'я, якая выхоўвае чацвёра дзяцей, патрабуе лёгкага адзення для 7-, 9- і 12-гадовых хлопцаў і для 5-гадовай дачкі.

• Сям'я, якая выхоўвае сямёра дзяцей, будзе ўдзячная за ўсякую дапамогу (адзенне, пасцель, старая мэбля).

• Жанчына патрабуе адзення для сыноў ва ўзросце 7 і 10 гадоў.

• Сям'я патрабуе пасцелі, пледаў і ўсякага нязнішчанага адзення для дзяўчат ва ўзросце 7, 11 і 14 гадоў.

• Студэнткі другога курса філалогіі будуць удзячныя за стары, але спраўны камп'ютэр, тэл. 662 70 36.

• Тры сям'і з Відава, што каля Бельска-Падляшскага, з ахвотай аддадуць зімовыя курткі, мужчынскія і жаночыя штаны, світэры ды іншае нязнішчанае адзенне, тэл. 730 40 00.

• Аддам дзіцячае адзенне ў добрым стане, тэл. 745 44 84.

• Аддам тапчан-полку з шафай, тэл. 651 80 20.

Сабрала Паўліна Шафран-Асташэвіч

Пасля доўгай і цяжкай хваробы адышоў ад нас добры сябра, настаўнік і дзеяч беларускай культуры
СЯРГЕЙ СЯВЕРЫН.
Шчырыя спачуванні сям'і пакойнага перадаюць сябры з Беларускага грамадска-культурнага таварыства і Беларуска-народнага выбарчага камітэта.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 600 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2004 r. upływa 5 czerwca 2004 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na III kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Таўканіца з халадцом

Мой знаёмы, настаўнік з дыпломам часта наведвае бацькоў у вёсцы. На пытанне „Што ў хаце?" атрымлівае адзін адказ: „Ну, наварыў таўканіцы, нарабіў халадцу і пад'еў як чалавек".

І сваім расказам заўсёды наробіць такога смаку, што не ведаеш куды кінуцца, каб пакаштаваць таго смакоцця. Дарэмна абіваць парогі беластоцкіх сталовых ці рэстаранчыкаў. Там, калі і падаюць халадзец, дык толькі „літоўскі".

— Сам халадзец, без таўканіцы, не такі ўжо і смачны, — сцвярджаеш, пераможваючы лісточкі чырвоных буракоў або іншага зелля.

Падляшскі халадзец прасцейшы за літоўскі і найлепшы ў дуэце з таўканіцай. У ім найважнейшая вада — жывая, крынічная, проста з калодзежа.

І не менш важная адлегласць ад роднай хаты.

Чым далей падляшук ад хаты — тым большая ў яго прага паесці халадцу. Зразумелі гэта беларускія студэнты ў Варшаве, якія скарысталі халадзец у якасці рытуальнай стравы, якой „разгаўлялі" першакурснікаў у час атрасінаў. Халадзец з таўканіцай заўжды прысутнічаў у час студэнцкіх рэйдаў па родным краі і далёкіх замежных падарожжаў.

Памятаю, як у палове васьмідзесятых, разам з сябрамі з-пад Бельска ў Нямеччыне, кожны другі дзень або і часцей мы гатавалі халадзец з таўканіцай. І хоць у нашай краме нельга было купіць нармальную ваду, мы кіпяцілі газіраваную мінералку, якую пасля халадзілі ў лядоўні і залівалі ёй расцёртую цыбуліну з соллю і воцатам. Недахоп свойскага сала да таўканіцы мы вырашалі тады скваркамі з салямі, што зацята крытыкавалі:

— Гэта, у параўнанні з нашай таўканіцай — нішто!

Калі нашы сябры-палякі дзівавалісь нашым падляшска-беларускім прывычкам і пачыналі крытыкаваць наш халадзец, мы кідаліся ў агонь палемікі:

— Такі разумны? Якая была любімая страва Тадэвуша Касцюшкі? — правакавалі мы.

— No, na pewno nie ten wasz chołodeć?

— Ласьне што халадзец!

Тадэвуш Касцюшка ў часы пераможнага змагання за Варшаву, як сведчаць крыніцы, адмовіўся ад каралеўскай кухні, свайму кухару загадваў дзень у дзень гатаваць халадзец з таўканічкай. Паеўшы як чалавек, вёў за сабой у бой тысячы змагроў.

— To pewnie i Mickiewicz lubił ten wasz chołodeć? — не адступалі палемісты.

На гэтым фронце іх чакала таксама паражэнне. Міцкевіч у сваю чаргу да апантанасці любіў сала. Нават пры смерці, калі лекар забараніў усякіх страў, Міцкевіч зламаў дыету і наеўся сала!.. І хоць сала не да халадцу, а да таўканіцы — як мы ўжо даказалі — халадзец найсмачнейшы з таўканіцай і наадварот.

Зараз, калі чытаю кулінарныя рэцэпты і прапановы нашых гаспадынь для турыстаў, бачу ўжо поўнае паражэнне. Менавіта, чаму ніхто не прапануе там халадцу з таўканіцай? А, раптам, прыедзе з грашыма фанат Касцюшкі або Міцкевіча і захоча „пад'есці як чалавек"? **(гак)**

Музычныя навіны

Еўравізія — фестываль халтуры і тандэты. Чакалі мы сёлета Еўравізіі з нецярплівасцю. Па-першае, з'явілася магчымасць, каб у фестывалі прэзентаваліся беларускія выканаўцы. Па-другое, беларусы ў час адборачнага канцэрту паказалі сваю музычную спеласць і добры густ. Выбралі, з папсовай балбатні, зусім непапсовы фольк-акустычна-рокавы дуэт Аляксандра & Канстанцін. Дарэчы, Польшча таксама абрала накірунак прафесіяналізму і амбіцыяналізму ў музыцы. Паехалі адтуль вядомыя „Блю-Кафэ". Аказалася яно вялікай памылкай. Еўравізія не патрабуе амбітнай і высакаякаснай музыкі, яна поўнасцю прапагандуе музыку без ніякіх эмоцый, мелкую, якая забываецца слухачу ўжо хвіліну пасля прэзентацыі.

Беларусы, каб дабіцца да „галоўнай" эстрады, павінны былі тры дні да фіналу перамагчы на паўфінальных змаганнях. Не ўдалося. Шкада! Гледзячы на атмасферу, можна было неяк так адчуць, што ў тым выпадку „палітыка перамагла культуру". Усюдыіснае палітычнае неадабрэнне беларускіх улад дасягнула і музыкі. Балючае, але сапраўднае. Але чаму я дзівуюся? Беларусь адбілася ў фінале і „ўдарыла" таксама палітычна. Як адзіная калегія журы прызнала найбольшую колькасць балаў расійскаму выканаўцу. Не спадабалася гэта гаспадарам фестывалю — турчынам — і ў голас паказалі яны сваё незадавальненне. Еўравізія чарговы раз не ўдалася і палякам. „Блю-Кафэ" заваявалі толькі 17-е месца. Ці прычынай была кепская крэацыя Тацяны Акупнік, ці, як у выпадку А&К, надта прафесійны падыход да фестывалю. Не ведаю.

Цешыць, што перамаглі ўкраінцы. Яны, як адзіныя, захаваліся сваёй кампазіцыяй у маёй „зануджанай" галаве. Руслана паказала даволі нармальны музычны стыль без несапраўдных эмоцый і кепскага акцёрства.

На канец мушу выказаць вялікі непакой наконт якасці музыкі прэзентаванай у Еўравізіі. Усім жыхарам свету (Азіі, Амерык, Афрыкі, Аўстраліі) гэты фестываль безумоўна з'яўляецца паказчыкам музычных накірункаў еўрапейскай музыкі. Ці нехта з нас можа сказаць, што зараз яно так ёсць і гэта сапраўдны вобраз еўрапейскіх музыкаў? Думаю, што не. Не згаджаюся з такім „псеўдамузычным" вобразам майго кантынента. Тая музыка, што мы пачулі ў Еўравізіі, не заваюе свету. А падобнае ўмее стварыць кожны другі вясельны гурт на Падляшшы, прытым намнога меншымі фінансавымі сродкамі. А мо сапраўды праз год палякі і беларусы павінны „паставіць" на дыска-пола. Перамога была б гарантаваная...

Мабыць ужо напрыканцы траўня з'явіцца новы міні-альбом праекту „Крамбамбуля". Зараз крамбамбульчыкі моцна працуюць у студыі гуказапісу. Разам з беларускімі музыкамі супрацоўнічаюць украінскія „Воплі Відоплясова" і „Мандры". На міні-альбоме новая вакалістка — Гюнеш Абасава.

Гурт „Стары Ольса" запісаў аўдыёспектакль паводле аповесці Уладзіміра Караткевіча „Ладдзя роспачы". Ролі выканалі ўдзельнікі гурту. У аздабленні пастаноўкі выкарыстаны кампазіцыі з усіх альбомаў „Старога Ольсы", у тым ліку і з яшчэ невыдадзеных. **Татка Стэп**

Крыжаванка



1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12 13 14 15 16 17 18 19 20 21

1. месца нараджэння дзіцяці, прынесенага буслам, 2. месца нараджэння Францішка Аляхновіча і Канстанцыі Буйло, 3. эмбрыён пажару, 4. месца нараджэння Уладзіміра Караткевіча, 5. месца нараджэння дакументаў, 6. пляцоўка з вуллямі, у якой нараджаецца мёд, 7. месца нараджэння фестывалю царкоўнай музыкі. **(ш)**

Рашэнне крыжаванкі — асобу і месца яе нараджэння — складуць літары з упарадкаваных курсівам клетак.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Рашэнне адгаданкі з 15 нумара

Красавік; ікра, квас; і скварка.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

23.05 – 29.05

Баран (21.03. — 19.04.) Перад табою новыя шляхі. Дзякуючы аптымізму шмат што зробіш. Любоў — скарб, аб які трэба пастаянна дбаць. Не апускайся ў хатніх абавязках.

Бык (20.04. — 20.05.) Не дай звесціся новапазнаным асобам. Магчымыя расчараванні і фінансавыя клопаты. У Быкоў з другой дэкады магчымыя непаразуменні з-за разлезласці, гумораў і недахопу самакрытыкі.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Старайся не афармляць важных спраў. Лёгка можна Цябе звесці, уцягнуць у сітуацыі, якіх пасля можаш шкадаваць і якія цяжка будзе „адкрунуць". Зноў паявяцца ўпэўненасць і энергія. Можаш здзейсніць свае мары. Змяні штосьці ў сабе, калі хочаш выклікаць у партнёра тое што табе трэба.

Рак (22.06. — 22.07.) Дысцыпліна і сіла волі — справішся з кожным выклікам лёсу. Блізкая Табе асоба ўчыніць памылку, але не злачынста. Зноў вернуцца згода і зразуменне.

Леў (23.07. — 22.08.) Прыдасца табе больш памяркоўнасці — будзеш мець схільнасць да рызыкоўных дзеянняў. Спакайней у сям'і. Не спадзявайся цудаў па Блізнятах і Рыбах, а Шалям можаш давяраць. 23.05. — 25.05. добра выдасі грошы, да таго заашчадзіш.

Дзева (23.08. — 22.09.) Лягчэй справішся з неабходнасцю прымаць стратэгічныя рашэнні. Самотныя Дзевы, асабліва з 31.08. — 3.09., знойдуць нагоду, каб прыцягнуць кагосьці незвычайнага і каму поўнасцю змогуць давяраць. Не плануй большых закупак, каб не выдаць замнога грошай.

Шалі (23.09. — 23.10.) Твая канцэнтрацыя на прафесійных справах выкліча пратэсты ў сям'і. 24.05. — 26.05. — ідэальны час на сустрэчы ў кампаніі. Зайграй у лато; можаш трапіць галоўны выйгрыш. 25.05. — 29.05. аслабленне нерваў, падатлівасць на стрэс. Адпачывай пры агні (вогнішча, свечкі).

Скарпіён (24.10. — 21.11.) Запланый выезд з сябрамі (23.05. — 25.05.), асабліва за мяжой будзеце добра гуляць, наведваючы знаёмыя месцы. Непаразуменні ў сям'і выясняцца самі. Агорне Цябе прага ўлады і ахвота здабыць багацце; спрабуй шчасця ў іграх і конкурсах.

Стралец (22.11. — 21.12.) Да 24.05. — карысныя нагоды ў фінансавым і прафесійным плане. 22.05. — 26.05. можна не баяцца экзаменаў, тэстаў, праверак і кваліфікацыйных размоў. Будзь больш сціплы і ўсведамляй свае абмежаванні.

Казярог (22.12. — 20.01.) 23.05. — 27.05. спрыяльныя ўмовы для размоў з каханай асобай, знакаміты час на заручыны і важныя рашэнні аб будучыні. У сям'і можа паявіцца новая асоба. Вельмі працавіты тыдзень. Можаш пасварыцца з завіснікам.

Вадалей (21.01. — 19.02.) 25.05. — 29.05. будзеш здольны да найбольшага шаленства і можаш паводзіць сябе непрадказальна. У тваіх прафесійных дзеяннях — адпаведны напрамак.

Рыбы (20.02. — 20.03.) 23.05. — творчыя праекты. Перабоі ў добрым паразуменні з атачэннем. Абнаўленне дому паправіць таксама і настрой. Не забудзь і аб рамонце сваіх сківіц.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960